

ГАРАНТЫІ ДЛЯ ДОНАРАЎ 7

ТЭЛЕВАНДРОЎКІ ДА ВЫТОКАЎ 8




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

7 ЖНІЎНЯ 2018 г. АЎТОРАК № 149 (28765)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Анатоль ЧОРНЫ, міністр архітэктуры і будаўніцтва:**

*«Даўгабуды ў нас практычна завершаны пасля адпаведнага даручэння Прэзідэнта. Ёсць асобныя пазіцыі — звышнарматыўныя дамы. Там у кожнага дома свая гісторыя: дзесьці не паспелі адкрыць фінансаванне, дзесьці не паспелі запоўніць дольшчыкамі дамы і пачынаюць будаваць з няпоўнай укамплектаванасцю, таму тэрміны будаўніцтва зацягваюцца. Гэтыя аб'екты на асаблівым кантролі. Ёсць магчымасці, стаіць задача скончыць да верасня будаўніцтва такіх дамоў і ўвесці іх у эксплуатацыю. Таксама адзначу, што задача па ўтрыманні суадносін заработнай платы і кошту квадратнага метра з 2017 года выконваецца. Сёлета па выніках паўгоддзя гэтыя суадносіны складаюць 0,91».*

# БУСЛЫ СПАДАРА АЛЯКСЕЯ



**На працягу васямнаццаці гадоў, а менавіта з 2000-га і па сёння, Аляксей СЕМЯНЯКА вядзе назіранні за вясковымі буслами. Калі настаўнік біялогіі і геаграфіі прыехаў у вёску Стахава Столінскага раёна жыць і працаваць, адразу ж стаў улічваць гнёзды, папаўненне ў бусліных сем'ях, запісваць цікавыя факты экалогіі і эталогіі, прылёты і адлёты птушак. Вёў дзённікі. Такіх грунтоўных назіранняў у адным населеным пункце, якія робіць гэты грамадскі арнітолаг, у краіне, бадай, ніхто ніколі не рабіў. Паводле даследаванняў Аляксея, пік колькасці стахаўскіх буслоў назіраўся ў 2005 годзе: 34 жылыя гнязды. А вось сёлетні сезон ён называе не самым паспяховым у плане буслінай дэмаграфіі: у дваццаці пяці гнёздах вывелася толькі васемдзесят шэсць буслянят. Свае назіранні і дзённікі стахаўскі арнітолаг перадае ў Брэст, у Палескі аграрна-экалагічны інстытут Акадэміі навук.**

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

• Вядомы кампазітар, народны артыст Беларусі і СССР, прафесар, акадэмік, доктар навук Ігар Лучанок адзначыў учора сваё 80-годдзе. З юбілеем артыста павіншаваў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.



**• Грашовыя пераводы беларусам з-за мяжы ў II квартале 2018 года скараціліся на 18 % у параўнанні з аналагічным перыядам 2017-га.**

• Беларусь аднавіла пастаўкі цэменту на экспарт. Праблемы з недахопам на ўнутраным рынку ў маі—чэрвені былі выкліканы тым, што практычна ўвесь яго аб'ём быў раскуплены.

**• У Гродне жанчына ўдарыла міліцыянера абцасам у галаву. Інцыдэнт адбыўся ў адной з устаноў грамадскага харчавання, дзе занадта шумна сябе паводзіла нецвярозая кампанія.**

■ Свая справа

# «МУЖ ПРЫВУЧАЎ МЯНЕ ДА ПЧОЛ ПАСТУПОВА...»

### Як сям'я пчаляроў зрабіла аматарскае захапленне мясцовай славутасцю

**Убачыць Міхаіла РАДЗЮКА за работай — нібы паназіраць за адважным дрэсіроўшчыкам. Не, ніякіх буйных жывёл. Наадварот, падапечныя мужчыны памерам усяго толькі з пазногаць. Але прызнайцеся, мала хто, акрамя вопытнага пчаляра, адважыцца засунуць рукі ў пчаліны дамок.**

СТАР. 5



Вопытны пчалавод расказвае пра кожную сям'ю на пчальніку як пра добрых знаёмых.

■ Прыёмная кампанія — 2018

# МЕДЫЦЫНА, ПРАГРАМАВАННЕ, МІЖНАРОДНАЕ ПРАВА

## За якую адукацыю гатовы плаціць абітурыенты?

**Не сакрэт, што ў апошнія гады трапіць на платнае навучанне ў ВНУ можна нават з мінімальнай колькасцю балаў. Адзінае абмежаванне — гэта ніжні парог на ЦТ, устаноўлены для профільных прадметаў. Але ж ці можна лічыць сур'ёзным бар'ерам 10 або 15 балаў? А для ВНУ сілавых ведамстваў, ваенных факультэтаў грамадзянскіх ВНУ і шэрагу сельскагаспадарчых спецыяльнасцяў устаноўлена яшчэ ніжэйшая планка, якая складае ўсяго 7 балаў...**

### Фізіка зноў у аўтсайдарах

4 жніўня ў вышэйшых навучальных установах завяршыўся прыём дакументаў на платную форму навучання ў ВНУ і стала відавочна, што абітурыентаў на ўсіх... не хапае. Цікава, што колькасць платных месцаў у некаторых ВНУ істотна перавышала колькасць бюджэтных па той жа спецыяльнасці, як, напрыклад, на факультэце міжнародных адносін БДУ. Гэты факультэт б'е ўсе рэкорды ў краіне як па прахадных балах, так і па кошце навучання. Тым не менш колькасць ахвотных вучыцца тут не змяншаецца.

СТАР. 4


ISSN 1990 - 763X

18149>

9 771990 763008

# БОЛЬШ ЗА 60 % ПЛОШЧАЎ УБРАНА

## Па намалоце лідзіруе Міншчына

**Беларускія аграрыі сабралі з палёў больш за 3,6 млн тон збожжа. Па аператыўнай інфармацыі Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання, усяго прадстаўнікі сельгасарганізацый убралі ўраджай з 62,1 % плошчаў. Сярэдняя ўраджайнасць па краіне склала 27,8 ц/га.**

Аграрыі Мінскай вобласці намалацілі 962,7 тысячы тон збожжавых і зернебабовых культур. На другім месцы сельгасарганізацыі Брэстчыны, якія сабралі 849,2 тысячы тон. На трэцяй пазіцыі Гродзенская вобласць з вынікам 758,2 тысячы тон. У Віцебскай вобласці сабралі 379,5 тысячы тон збожжавых і зернебабовых. На Магілёўшчыне і Гомельшчыне 367,6 тысячы тон і 366,6 тысячы тон адпаведна. Па сярэдняй ураджайнасці лідзіруе Гродзенская вобласць з вынікам 29,9 ц/га.

На Міншчыне ўбралі 67 % пасяўных плошчаў. На намалоце лідзіруе Слуцкі раён, дзе сабрана больш за 100 тысяч тон збожжа. У Нясвіжскім — больш за 92 тысячы тон, а ў Капыльскім раёне — больш за 72 тысячы тон. Мінскі раён знаходзіцца на чацвёртым месцы з вынікам 64 тысячы тон. Пяцёрку лідараў замыкае Пухавіцкі раён, дзе збожжавых сабралі ў аб'ёме каля 56 тысяч тон.

Намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення — **начальнік упраўлення раслінаводства Мінсельгасхарча Васіль ЯДЛОЎСКІ** заявіў, што валавы збор зялёнай масы кукурузы сёлета чакаецца на 2 млн тон большы за леташні. У гэтым годзе ён прагназуецца ў аб'ёме не меншым за 23 млн тон. «Гэта дасць нам прыбаўку ў 0,5 млн тон кармавых адзінак. Такім чынам за кошт кукурузы мы будзем часткова кампенсаваць недабор травяных кармоў і збожжа», — растлумачыў Васіль Ядлоўскі.

Ён таксама падкрэсліў, што патрэбы жывёлагадоўлі ў кармах будуць забяспечаны цалкам.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**




## Цэны

# АД 77 ДА 181 РУБЛЯ

### У колькі абыдзецца форма для школьнікаў?

**Да новага навучальнага года «Беллегпрам» выпусціць 350 новых мадэляў швейных вырабаў. Яшчэ 150, якія летась карысталіся найбольшым попытам, запланавана да паўторнага выпуску.**

Кошты на камплекты адзення дзелавога стылю для школьнікаў вагаюцца ад 77 да 181 рубля. Набыць жакет, камізэльку, спадніцу і блузку для дзяўчатак 1—4 класаў абыдзецца ў 77—120 рублёў, для 5—9 класаў — 79—130 рублёў, для 10—11 — 116—165 рублёў. Камплект для хлопчыкаў (у складзе якога пінжак, штаны і кашуля) 1—4 класаў будзе каштаваць ад 85 да 106 рублёў, для 5—9 класаў — ад 96 да 125 рублёў, для 10—11 — ад 123 да 151 рубля. Той жа набор, але з камізэлькай будзе даражэйшы на 15—30 рублёў. Гэта адпускныя цэны з падаткам на дабаўленую вартасць, гандлёвую надбаўку крамы ўстанаўліваюць самастойна.

У «Беллегпраме» адзначаюць, што прыслухоўваюцца да пажаданняў вучняў і іх бацькоў, Міністэрства адукацыі. Напрыклад, прапануюць мадэлі з трыкатажу, якія не абмяжоўваюць рух, выкарыстоўваюць спалучэнні розных фактур тканіны, нятканыя матэрыялы, каб зрабіць форму больш разнастайнай.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ**




## Тры пытанні да ўлады

# ГОРАД — ПРЫЦЯГАЛЬНЫ ДЛЯ МОЛАДЗІ І КАМФОРТНЫ ДЛЯ ЖЫЦЦЯ

### Такімі стануць Крупкі ў недалёкай перспектыве


Фота БелТА.

**Анатоль КОЗЕЛ чатыры месяцы таму прызначаны старшынёй Крупскага райвыканкама. Здавалася б, не такі і працяглы тэрмін. Але ў раёне шмат робіцца, каб жыццё людзей стала больш зручным і камфортным. Пра планы на будучыню і шмат іншага новы кіраўнік расказаў «Звяздзе».**

**— Анатоль Станіслававіч, вашы папярэднікі нямала зрабілі для развіцця Крупскага раёна. Вы, як новы чалавек са свежымі поглядамі, на што звярнулі ўвагу і з чаго пачалі сваю дзейнасць?**

— У нашай рабоце няма другасных пытанняў. Сацыяльна-эканамічнае развіццё — працэс комплексны, у якім усё ўзаемазвязана. Я ўпэўнены, што крокі паступальнага развіцця будуць там, дзе кіраўнік, як галоўны стратэг, каардынуе ўвесь комплекс напрамкаў і задач. Да гэтага імкнуся сам, на гэта нацэльваю сваіх калег. Да таго ж лічу найбольш эфектыўнымі падыходамі ў рабоце — арганізаванасць, дакладны парадак і планамернасць. Так, у штодзённай рабоце заўсёды з'яўляюцца непрадбачаныя сітуацыі, якія неабходна вырашаць аператыўна. Але асновай для дзеянняў павінен быць рэальны, вылічаны план, выкананне якога дазволіць падымацца па лесвіцы сваіх жа спраў на новую, больш высокую, ступень. На гэта ў першую чаргу і звяртаю ўвагу ўсіх кіраўнікоў і выканаўцаў.

**— Што ўдалося зрабіць з таго часу, як заступілі на новую пасаду?**

— У раёне актыўна ідзе навядзенне парадку на зямлі і добраўпарадкаванне населеных пунктаў. У гэтую работу ўцягнуты ўсе. Асноўная роля тут адводзіцца органам мясцовага самакіравання, якія адказваюць за свае тэрыторыі. Канкрэтныя задачы пастаўлены перад прадпрыемствамі і арганізацыямі. Па сваёй сутнасці добраўпарадкаванне і навядзенне парадку на зямлі — гэта не проста прыборка тэрыторый. Гэта — стан дарог, крыніц водазабеспячэння, міні-палігонаў, могілак, аб'ектаў інфраструктуры, рацыянальнае выкарыстанне зямлі і гэтак далей. Распрацаваны, скарэктаваны графік работы службаў, пачалося будаўніцтва новай водаправоднай сеткі ў адным з мікрараёнаў. Усё нацэлена на тое, каб беражлівыя адносіны да сваёй зямлі сталі пытаннем асабістай адказнасці кожнага крупчаніна.

У раёне ўзводзіцца жыллё, апошні прыклад — 40-кватэрны жылы дом. Людзі маюць магчымасць для індывідуальнага будаўніцтва. У цэлым народнагаспадарчы комплекс працуе ў штатным рэжыме.

Праблем, канешне, шмат, але яны вырашаюцца. Мы ў тэрмін правялі сяўбу, цяпер убіраем ураджай, працуем без скідак на ўмовы надвор'я.

**— Які патэнцыял у раёна і якімі бачыце Крупкі ў перспектыве?**

— Раён валодае дастаткова нядрэнным патэнцыялам. Моцнымі нашымі бакамі і перавагай з'яўляюцца развіты аграпрамысловы комплекс, выгаднае геаграфічнае становішча, наяўнасць шэрагу прыродных рэсурсаў для вытворчасці будаўнічых матэрыялаў і паліўнай прамысловасці, добрая забяспечанасць воднымі рэсурсамі. Ёсць нядрэнныя аб'екты сацыяльнай інфраструктуры.

У планах — рэалізацыя некалькіх буйных інвестыцыйных праектаў, на якія ўскладваем вялікія надзеі. Гэта — будаўніцтва міні-гідраэлектрастанцыі на рацэ Бобр у горадзе Крупкі.

Пяць праектаў ужо рэалізуюцца і плануюцца да выканання на базе адкрытага акцыянернага таварыства «Туршоўка». Галоўны з іх — будаўніцтва цэха па кіпаванні торфу з устаноўкай прэса аб'ёмам 6 м$^3$, лініі сепарацыі і ўладкаваннем галерэі для падачы і транспарціроўкі торфу. Рыхтуюцца і будуюцца фрэзерныя палі для здабычы. Ёсць і іншыя планы. У будучым я бачу Крупкі камфортным для пражывання людзей горадам, горадам цікавым і прыцягальным для моладзі.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## ДЛЯ ЗАМАХУ НА МАДУРА ВЫКАРЫСТАЛІ ДВА ДРОНЫ З КІЛАГРАМАМ ВЫБУХОЎКІ НА КОЖНЫМ



Арганізатары суботняга замаху на прэзідэнта Венесуэлы Нікаласа Мадура выкарысталі два прамысловыя беспілотныя лятальныя апараты, на якіх размясцілі па 1 кг выбухоўкі З-4. Пра гэта венесуэльскі міністр унутраных спраў, юстыцыі і па пытаннях міру Нестар Рэвероль заявіў у эфіры тэлеканала Telesur. «Дзякуючы спецыяльнай тэхніцы ганаровай прэзідэнцкай гвардыі дрон удалося вывесці са строю, і ён быў актываваны па-за перыметрам [дзе знаходзілася кіраўніцтва краіны]», — сказаў Рэвероль. Паводле яго слоў, улады затрымалі шасцярых падазраваных у спробе забіць кіраўніка дзяржавы. «Затрыманы шэсць тэрарыстаў. Уся значная інфармацыя і відэа з доказамі сабраны, ідэнтыфікаваныя арганізатары і непасрэдныя выканаўцы злачынства ўнутры і за межамі краіны», — заявіў міністр.

«Спроба замаху на прэзідэнта Баліварыянскай Рэспублікі Венесуэла Нікаласа Мадура, у выніку якой атрымалі раненні сем чалавек, з'яўляецца варварскім і нялюдскім актам тэрарызму», — адзначаецца ў заяве беларускага МЗС. З асуджэннем спробы замаху і гвалту выступілі таксама шэраг дзяржаў, у прыватнасці Расія, Сірыя, Турцыя, Нікарагуа, Куба, Сальвадор і Іспанія.

## КІРАЎНІК БРЫТАНСКАГА МІНФІНА ЗАКЛІКАЎ БІЗНЕС ПРЫТРЫМЛІВАЦЦА НЕЕЎРАПЕЙСКАЙ СТРАТЭГІІ РАЗВІЦЦЯ РЫНКУ

Вялікабрытанія павінна развіваць альтэрнатыўныя шляхі росту свайго фінансавага сектара, каб кампенсаваць магчымыя страты бізнесу ў выніку брэксіту. Пра гэта заявіў міністр фінансаў Вялікабрытаніі Філіп Хаманд на сустрэчы з кіраўнікамі вядучых арганізацый лонданскага Сіці, паведамляе газета Financial Times. «Важна, каб Вялікабрытанія магла дэманстраваць паралельную, нееўрапейскую стратэгію развіцця рынку фінансавых паслуг, калі пагроза выхаду з пагадненняў з ЕС стане рэальнай», — адзначыў кіраўнік мінфіна. Новыя партнёрскія адносіны, як сказаў ён раней, будуць арыентаваныя на Кітай, Індыю, Паўднёвую Карэю і Аўстралію. Хаманд таксама папярэдзіў вядучых дзеячаў аднаго з найбуйнейшых сусветных фінансавых цэнтраў пра тое, што не збіраецца скарачаць падаткі на прадпрымальнікаў «на працягу некалькіх гадоў».

## КОЛЬКАСЦЬ АХВЯР ПАДЧАС ЗЕМЛЕТРАСЕННЯ Ў ІНДАНЕЗІІ ПЕРАВЫСІЛА 90 ЧАЛАВЕК



Колькасць ахвяр землетрасення на інданезійскім востраве Ламбок перавысіла 90 чалавек. Пра гэта паведаміла Нацыянальнае агенцтва па барацьбе са стыхійнымі бедствамі. Яшчэ сотні людзей атрымалі раненні. 10 тысяч чалавек былі эвакуіраваны ў бяспечныя месцы. Сур'ёзна пацярпеў буйны горад Матар. Пашкоджана мноства будынкаў. Магнітуда падземных штуршкоў дасягала 7 балаў. Аэрапорты на Ламбоку працуюць у штатным рэжыме, нягледзячы на невялікія пашкоджанні ў тэрміналах. Турысты масава пакідаюць востраў. Эпіцэнтр землетрасення знаходзіўся за 49 кіламетраў на паўночны ўсход ад горада Матар, а ачаг залягаў на глыбіні 10 кіламетраў. Пасля землетрасення адбылося не менш за 130 афтэршокаў. Штуршкі таксама адчуваліся на востраве Балі — найбольш папулярным турыстычным напрамку, аднак там разбурэнняў зафіксавана не было.

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў спачуванне Прэзідэнту Інданезіі Джока Відода ў сувязі са шматлікімі чалавечымі ахвярамі і разбурэннямі ў выніку моцных землетрасенняў, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што ў Беларусі з вялікім болем і смуткам успрынялі вестку аб гэтай трагедыі.**

■ Агульны клопат

# Выбірайце экалагічны адпачынак!

**З 27 ліпеня да 20 жніўня ў краіне праходзіць акцыя «Адпачынак без шкоды прыродзе».**

— Галоўная яе мэта — папулярызацыя беражлівых адносін грамадзян да наваколля, прадухіленне парушэнняў прыродаахоўнага заканадаўства і непрычыненне шкоды навакольнаму асяроддзю падчас іх адпачынку на прыродзе, — расказала **прэс-сакратар Мінпрыроды Алена МЕЛЯШКОВА.**

У апошнія летнія дні дзяржінспектары па ахове навакольнага асяроддзя арганізоўваюць рэйды ў зонах адпачынку каля вадаёмаў, у месцах аматарскага рыбалоўства, на асабліва ахоўных прыродных тэрыторыях (ААПТ), каб папярэдзіць парушэнні грамадзянамі прыродаахоўнага заканадаўства, а таксама праводзяць з беларусамі і гасцямі з замежжа растлумачальную работу, як арганізаваць адпачынак і не нашкодзіць прыродзе.

Па словах Алены Меляшковай, хоць у краіне з кожным годам усё больш ствараецца спецыяльных месцаў для адпачынку і павышаецца ўзровень экалагічнай культуры грамадзян, на жаль, па-ранейшаму сустракаюцца выпадкі безадказных адносін адпачывальнікаў да наваколля. Так, людзі даволі часта разводзяць вогнішчы і размяшчаюць адходы ў забароненых месцах, выпальваюць сухую расліннасць, мыюць і ставяць транспартныя сродкі па-за спецыяльнымі пляцоўкамі, пашкоджваюць і знішчаюць насаджэнні, чырванакніжныя расліны і іншае.

*У Мінпрыроды таксама распрацавалі памятку па бяспечным для прыроды адпачынку:*

1. Адпачывайце ў спецыяльна абсталяваных зонах і месцах.

2. Падчас адпачынку на асабліва ахоўных прыродных тэрыторыях (нацыянальны парк, заказнік, запаведнік) выконвайце іх рэжым аховы і выкарыстання (гэтую інфармацыю можна знайсці на афіцыйных сайтах ААПТ).

3. Паркуйце механічныя транспартныя сродкі ў прадугледжаным для гэтага месцы ці не бліжэй чым за 30 метраў ад берагавой лініі. Мыццё транспартных і іншых тэхнічных сродкаў у межах водаахоўных зон не дапускаецца.

4. Не пашкоджвайце жывое наглебавае пакрыва, напрыклад пратэктарамі шын аўтамабіляў.

5. Не разводзьце вогнішчы ў забароненых месцах. У дазволеных — рабіце гэта па правілах, а лепш выкарыстоўвайце мангал ці жароўню.

6. Не сячыце і не знішчайце драўнінна-хмызняковую расліннасць — прывозьце дровы ці вугаль з сабой.

7. Не наносьце шкоды жывёлам і раслінам.

8. Не чапайце мурашнікі, гнёзды, норы і іншае жыллё дзікіх жывёл.

9. Убірайце за сабой смецце.

Варта адзначыць, што парушэнне амаль кожнага з гэтых пунктаў, згодна з прыродаахоўным заканадаўствам, караецца папярэджаннем ці штрафам.

**Вераніка КОЛАСАВА**

■

■ Развітанне

# Канец музычнай эпохі

## Пайшоў з жыцця вядомы рокер Аляксандр Кулінковіч


neurodubel.com.

Лідар гурта «Нейра Дзюбель» трапіў у адну са сталічных бальніц у мінулую пятніцу. Дрэнна яму стала літаральна праз пару дзён пасля рэпетыцыі — гурт збіраўся выступіць на буйным музычным фестывалі «Рок за Баброў» і арганізатары да канца спадзяваліся, што ўсё абыдзецца. Медыкі дыягнаставалі рэзкае абвастрэнне недалечанай пнеўманіі, але, на жаль, дапамагчы музыканту ўжо не змаглі. 4 жніўня Кулінковіча не стала — усяго на 47-м годзе жыцця. «Скончыўся наш «Нейра Дзюбель», — з болем канстатавалі сябры.

Развітанне са стваральнікам, бадай, самага вядомага беларускага панк-гурта, прайшло ў крэматорыі Паўночных могілак Мінска 5 жніўня. Аддаць даніну павагі светлай памяці Аляксандра Кулінковіча прыйшлі шмат дзясяткаў людзей — сябры і родныя, калегі па сцэне, у тым ліку ўдзельнікі гурта «Нейра Дзюбель» розных гадоў, музычныя журналісты і крытыкі, верныя прыхільнікі, — самая вялікая рытуальная зала ледзьве змясціла ўсіх. У апошні шлях музыканта праводзілі пад ягоную песню «Мост праз неба» — доўгімі апладысментамі. «Мне здаецца, гэтыя апладысменты застануцца ў маёй галаве надоўга... Звычайна я апладзіравала яму ад душы на канцэртах, мінулы раз — на карпаратыве ўласнай кампаніі, адчуваючы неверагодны гонар, — падзялілася эмоцыямі пляменніца Кулінковіча Святлана. — Для кагосьці ён быў рок-зоркай, для кагосьці паэтам, для кагосьці артыстам... Дзякуй табе, дзядзя Саша, за ўсё. Я буду помніць!»

«Звязда» выказвае спачуванні сваякам і сябрам Аляксандра Кулінковіча. Бессэнсоўна пісаць доўгія некралогі пра чалавека, які стаў сімвалам для цэлага пакалення суайчыннікаў. Таму мы проста будзем помніць і слухаць, знаходзячы на 16 «дзюбелеўскіх» альбомах штосьці, блізкае кожнаму... Светлая памяць!

■

■ Надвор'е

# СПЁКА СПАДЗЕ НЕНАДОЎГА

**Як паведамілі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды, праз некалькі дзён спякотнае надвор'е зноў авалодае краінай.**


Фота БелТА.

«У другой палове тыдня ў Беларусь вернецца спёка, а ў пачатку тыдня камфортнае надвор'е абумовіць паветраная маса балтыйскага паходжання», — паведамілі ў Белгідрамецэ. Сёння, 7 жніўня, надвор'е ў асноўным будзе вызначаць вобласць павышанага ціску. Удзень малаактыўны франтальны раздзел абумовіць у некаторых раёнах кароткачасовыя дажджы з навальніцамі. Тэмпература паветра складзе 21—27 градусаў вышэй за нуль. У некаторых раёнах у сераду пад уплывам франтальнага раздзела, пераважна па паўночным усходзе, пройдуць кароткачасовыя дажджы, уначы і раніцай магчымы туман. Тэмпература паветра ўначы будзе плюс 11—16 градусаў, удзень чакаецца ад 23 градусаў па паўночным усходзе і да 31 — па паўднёвым захадзе Беларусі.

У чацвер надвор'е будзе вызначаць вобласць павышанага атмасфернага ціску і паветраная маса, якая рухаецца з паўднёвага захаду Еўропы. Нас чакае гарачае, практычна без ападкаў надвор'е. Тэмпература ўначы складзе 11—17 градусаў, удзень будзе ад 25 па ўсходзе да 33 градусаў цяпла па захадзе. 10 жніўня ападкаў таксама не прадбачыцца. Тэмпература паветра будзе яшчэ расці і складзе ўначы 14—20 градусаў вышэй за нуль, удзень — 27—33 градусы

■

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## НАШЫ ВАЛЬШЧЫКІ — ЧЭМПІЁНЫ

**Нацыянальная каманда вальшчыкаў Рэспублікі Беларусь у складзе Валерыя Дуровіча, Сяргея Шкудрова і Віктара Зарэмбы перамагла ў чэмпіянаце свету лесарубаў, які адбыўся ў Нарвегіі, паведамляе прэс-служба Міністэрства лясной гаспадаркі. 123 чалавекі з 27 краін прынялі ўдзел у гэтым маштабным свяце, якое праходзіла ў Лілехамеры.**

Наша зборная вальшчыкаў пад кіраўніцтвам намесніка начальніка ўпраўлення вытворчасці і рэалізацыі прадукцыі Мінлясгаса Уладзіміра Шута ў камандным заліку набрала 4879 балаў, на 19 ачкоў апярэдзіўшы сапернікаў з Германіі, і ў выніку заняла першае месца. Нагадаем, у 2016 годзе нацыянальная зборная Рэспублікі Беларусь першы раз у гісторыі заваявала ганаровы тытул чэмпіёна свету лесарубаў. У Лілехамеры каманда паўтарыла поспех, зноў стаўшы сусветнымі чэмпіёнамі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**



Фота БелТА.

**У Мінску на вуліцы Зыбіцкая з'явіўся мурал з беларускім арнаментам. Малюнак выканалі мастакі з каманды Zadelo.**

## У 2019 ГОДЗЕ ПРОЙДУЦЬ ДЗВЕ ЎНІВЕРСІЯДЫ

**На працягу ўсяго наступнага года Еўропе трэба будзе прыняць адразу пяць комплексных кантынентальных і сусветных першынстваў, з іх два — універсіяды.**

XXIX Сусветная зімовая ўніверсіяда 2019 года ў Краснаярску пройдзе з 2 па 12 сакавіка 2019 года. Спартсмены разыграюць 76 камплектаў узнагарод у 11 відах спорту: біятлон, гарналыжны спорт, кёрлінг, лыжныя гонкі, сноўборд, спартыўнае арыентаванне на лыжах, фігурнае катанне на каньках, фрыстайл, хакей, хакей з мячом, шорт-трэк. Ужо ў верасні пачнецца эстафета агню з удзелам 650 факеланосцаў.

XXX Сусветная летняя ўніверсіяда 2019 года ў Неапалі пройдзе з 3 па 14 ліпеня. 12 000 спартсменаў са 170 краін будуць змагацца за 250 камплектаў узнагарод у 17 спартыўных дысцыплінах: футбол, дзюдо, рэгбі, плаванне, тэніс, настольны тэніс, тэквандо, валейбол, водная пола, стральба з лука, спартыўная і мастацкая гімнастыка, фехтаванне, стральба кулявая, лёгкая атлетыка, баскетбол, скачкі ў ваду.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

## ГАРЭЎ ЦЭХ ФАСОЎКІ КУКУРУЗНЫХ ПАЛАЧАК

**Уначы уздзенскім ратавальнікам жанчына паведаміла, што гарыць дах вытворчага будынка ў вёсцы Каралёва.**

Калі на месца прыбылі падраздзяленні МНС, той палаў адкрытым полымем, як і другі паверх пабудовы. У ёй размяшчаліся вытворчыя і складскія памяшканні прыватных прадпрыемстваў па фасоўцы кукурузных палачак і цацак. Ратавальнікі не далі распаўсюдзіцца агню на прыбудаваны цагляны гараж, дзе знаходзіліся тры грузавыя аўтамабілі, а таксама перакінуцца на жылыя дамы, што стаяць на адлегласці дзесяці метраў ад месца пажару. Па інфармацыі Мінскага абласнога ўпраўлення МНС, агонь знішчыў дах вытворчага будынка на плошчы 700 квадратных метраў, пашкодзіў абсталяванне, маёмасць, сцены цэха фасоўкі кукурузных палачак. Пацярпелых не было. Вытворчасць не была абсталявана пажарнай сігналізацыяй, ахова адсутнічала. Прычыну пажару ўстанаўліваецца, разглядаецца некалькі версій, у тым ліку кароткае замыканне электраправодкі.

## СТУДЭНТКА ПАМЕРЛА АД ПСІХАТРОПУ

**А палове другой гадзіны ночы ў аператыўна-дзяжурную службу Першамайскага РУУС Мінска паступіла паведамленне пра смерць 19-гадовай студэнткі адной са сталічных ВНУ.**

Па інфармацыі следства, неўстаноўленая асоба напярэдадні трагедыі збыла маладым людзям асабліва небяспечнае псіхатропнае рэчыва з выкарыстаннем так званай закладкі. Наступным днём увечары кампанія з васьмі чалавек, чацвёра з якіх былі непаўналетнія, сабралася ў кватэры, дзе жыла загінулая дзяўчына, з мэтай сумеснага баўлення часу і ўжывання псіхатропу, набытага раней. Бацькі дзяўчыны дома адсутнічалі.

Набытае загадзя рэчыва было расфасавана з дапамогай электронных вагаў у пустыя капсулы ад медыцынскіх прэпаратаў. Кожнаму прызначалася па дзве капсулы з наркотыкам. Па адной капсуле прысутныя ўжылі адразу, астатнія пакінулі. Праз некаторы час гаспадыні «вечарынкі» стала дрэнна, яе госці выклікалі хуткую медыцынскую дапамогу. Нягледзячы на праведзеныя медыцынскімі работнікамі рэанімацыйныя мерапрыемствы, дзяўчына памерла па месцы жыхарства.

Следчымі сумесна з аператыўнымі супрацоўнікамі ўнутраных спраў праводзіцца работа па ўстанаўленні асоб, якія мелі дачыненне да супрацьпраўных дзеянняў. Прызначана правядзенне шэрагу экспертных даследаванняў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# МЕДЫЦЫНА, ПРАГРАМАВАННЕ, МІЖНАРОДНАЕ ПРАВА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Так, на 60 платных месцаў на спецыяльнасці «міжнародныя адносіны» сёлета прэтэндаваў 71 чалавек, іх 43 платныя месцы на спецыяльнасці «мытная справа» — 53 чалавекі, на 55 месцаў на спецыяльнасці «сусветная эканоміка» — 60 чалавек, прычым адзін з абітурыентаў меў суму балаў большую за 391. На спецыяльнасці «лінгвакраіназнаўства» чакалі залічэння на платныя месцы абітурыенты, якія мелі больш як 381 бал. Увогуле абітурыентаў з баламі ад 371 да 380 хапала на ўсіх спецыяльнасцях ФМА. Знайшліся і такія «смельчакі», якія мелі ў суме ад 121 да 151 бала і пры гэтым таксама спадзяваліся паступіць на самы прэстыжны факультэт. Інакш навошта яны падавалі свае дакументы? Хіба што толькі на ўсялякі выпадак?

**Інтарэс моладзі да міжнароднага, юрыдычнага і эканамічнага напрамкаў прасочваецца амаль ва ўсіх ВНУ.**

Добрым попытам карыстаўся ў абітурыентаў Белдзяржуніверсітэта таксама і біяфак, асабліва такія спецыяльнасці і напрамкі, як «біятэхналогія», «біяхімія» і «мікрабіялогія». Меншую цікавасць маладыя людзі праявілі да «біяэкалогіі» і «біялогіі» (навукова-вытворчай і навукова-педагагічнай дзейнасці).

Інстытуту бізнесу БДУ таксама ўдалося ўкамплектавацца. Не было праблем з запаўненнем платных месцаў на спецыяльнасцях «бізнес-адміністраванне» і «лагістыка». У Міжнародным дзяржаўным экалагічным інстытуце імя А. Д. Сахарава БДУ абітурыенты не прайшлі міма «медыка-біялагічнай справы» і «медыцынскай экалогіі». На механіка-матэматычным факультэце ў фокусе ўвагі былі ў першую чаргу IT-спецыяльнасці. На факультэце прыкладной матэматыкі і інфарматыкі на



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

19 месцаў было пададзена 28 заяў, прычым сярод абітурыентаў зноў жа былі ўладальнікі вельмі высокіх балаў (больш як 361). Але, напрыклад, эканамічная кібернетыка мала каго зацікавіла.

Інтарэс моладзі да міжнароднага, юрыдычнага і эканамічнага напрамкаў прасочваецца амаль ва ўсіх ВНУ, дзе ёсць падобныя спецыяльнасці. Так, у Гродзенскім дзяржаўным універсітэце ў цэнтры ўвагі моладзі на платнай форме навучання аказаліся «міжнароднае права», «правазнаўства», «лінгвістычнае забеспячэнне міжкультурных камунікацый» і «мытная справа». У Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэце — зноў-такі «правазнаўства», «сусветная эканоміка» і «лінгвістычнае забеспячэнне міжкультурных камунікацый» (напрамак — знешнеэканамічныя сувязі).

На журфаку ў БДУ самымі запатрабаванымі аказаліся аўдыявізуальная журналістыка (на 17 месцаў 26 ахвотных) і спецыяльнасць «інфармацыя і камунікацыя» (17 ахвотных на 15 месцаў). На іншыя спецыяльнасці журфака маглі паступіць усе, хто падаў дакументы. Увогуле на вельмі многіх спецыяльнасцях у БДУ колькасць пададзеных заяў не перавышала колькасці выдзеленых платных месцаў, а гэта значыць, што туды будуць залічаны абітурыенты нават з вельмі сціплымі баламі.

Даволі сумная сітуацыя назіралася на факультэце радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій, дзе на 20 месцаў было пададзена 10 заяў. Фізічны факультэт і Міжнародны дзяржаўны экалагічны інстытут імя А. Д. Сахарава БДУ праводзілі аб'яднаны конкурс на спецыяльнасці, звязаныя з фізікай: на 17 месцаў паступілі ўсяго 6 заяў. Дзеля справядлівасці трэба адзначыць, што і бюджэтныя месцы на гэтых спецыяльнасцях актыўным попытам не карысталіся.

## Нанатэхналогіі не цікавяць?

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі толькі ў дзень залічэння на платную форму навучання нарэшце агучыў кошты на наступны навучальны год. Навучанне на дзённай форме на факультэце камп'ютарных сістэм і сетак будзе каштаваць 3210 рублёў за год, на факультэце інфармацыйных тэхналогій і кіравання і інжынерна-эканамічным — 3070 рублёў, факультэце камп'ютарнага праектавання, факультэце інфакамунікацый і факультэце радыётэхнікі і электронікі — 2755 рублёў. Самай таннай з'яўляецца спецыяльнасць факультэта радыётэхнікі і электронікі «прафесійнае навучанне (інфарматыка)», дзе за год трэба будзе заплаціць 2090 рублёў.

Мы ўжо пісалі, што ўсе, хто добра здаў фізіку, выбіраюць пераважна спецыяльнасці IT-галіны. У БДУІРы абітурыенты з высокімі баламі (350—380) і на платнай форме навучання штурмавалі дзве спецыяльнасці самага дарагога і прэстыжнага факультэта камп'ютарных сістэм і сетак: «інфармацыя і тэхналогіі праграмавання» (115 месцаў і 125 ахвотных) і «праграмнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій» (249 прэтэндэнтаў на 95 месцаў).

На іншых факультэтах моладзь цікавілі спецыяльнасці «інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі (у бізнес-менеджменце)», «аўтаматызаваныя сістэмы апрацоўкі інфармацыі», «інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі ў гульнявой індустрыі». У аўтсайдарах аказаліся «інфакамунікацыйныя тэхналогіі», «электронныя вылічальныя сродкі», «мікра- і нанаэлектронныя тэхналогіі і сістэмы», «нанатэхналогіі і нанаматэрыялы ў электроніцы», «радыёінфарматыка», «радыёэлектронная абарона інфармацыі» і некаторыя іншыя спецыяльнасці. Улічваючы, што ў БДУІРы дзейнічае аўтаматызаваная сістэма залічэння і абітурыенты маюць магчымасць указваць у заяве ўсе спецыяльнасці тэхніка-тэхналагічнага профілю, расстаўляючы свае прыярытэты, можна меркаваць, што платныя месцы збольшага ўсё ж такі будуць запоўнены. Але калі сярэдні бал залічаных на бюджэтную форму навучання ў БДУІРы склаў сёлета 339, а суму балаў не меншую за 300 маюць больш як 75 працэнтаў будучых першакурснікаў, то якасныя паказчыкі залічаных на платную форму навучання будуць куды больш сціплыя. На некаторыя спецыяльнасці дакументы падавалі абітурыенты з сумай балаў ад 121 да 150, і ў іх ёсць усе шанцы таксама насіць званне студэнта БДУІРа.

## Куды ідуць з нізкімі баламі?

Што датычыцца вышэйшай медыцынскай адукацыі, то абсалютна без праблем запоўніліся ўсе платныя месцы ў Беларускім дзяржаўным медыцынскім універсітэце, прычым на спецыяльнасці «стаматалогія» шэсць абітурыентаў мелі балы ад 371 да 380, а 14 чалавек — ад 361 да 370. На фармацэўтычны факультэт падалі дакументы два абітурыенты з сумай балаў ад 361 да 370.

Педагагічная адукацыя карыстаецца ў моладзі меншым попытам. Ва ўсялякім разе, абітурыенты з такімі высокімі баламі педагагічныя спецыяльнасці рэдка выбіраюць. У БДПУ на платнай дзённай форме навучання найбольшая колькасць ахвотных была зарэгістравана на спецыяльнасці «лагапедыя» (78 прэтэндэнтаў на 60 месцаў), «псіхалогія» (116 прэтэндэнтаў на 75 месцаў), «сацыяльная і псіхолага-педагагічная дапамога» (24 прэтэндэнты на 10 месцаў), «руская мова і замежная мова» (26 прэтэндэнтаў на 15 месцаў) і «спартыўна-турыстычная дзейнасць» (менеджмент у турызме) — 96 заяў на 70 месцаў. У педагагічны ўніверсітэт таксама падавалі дакументы абітурыенты, якія маюць ад 121 да 130 балаў (за тры сертыфікаты плюс атэстат). І гэта будучыя педагогі!

А ў БНТУ спрабавалі паступіць на платныя месцы абітурыенты з баламі ад 101 да 110! Яны нацэліліся на такія спецыяльнасці, як «водагаспадарчае будаўніцтва», «прамысловае грамадзянскае будаўніцтва». На спецыяльнасці «аўтамабільныя дарогі» ў БНТУ на 10 платных месцаў не паступіла ўвогуле ніводнай заявы, а на спецыяльнасці «масты, транспартныя тунэлі і метрапалітэны» на 12 месцаў знайшоўся адзін прэтэндэнт з сумай балаў ад 131 да 140. Не карысталіся ў абітурыентаў попытам энергетычны, аўтатрактарны, прыборабудаўнічы факультэты, факультэт энергетычнага будаўніцтва. Затое на 30 месцаў на спецыяльнасці «мытная справа» паступіла 48 заяў. На 30 месцаў на спецыяльнасці «праграмнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій» — 43 заявы, «бізнес-адміністраванне» — 67 заяў на 40 месцаў.

З невысокімі баламі паступаюць абітурыенты і ў Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт. Конкурс на платныя месцы тут склаўся на спецыяльнасцях «турызм і прыродакарыстанне» (33 чалавекі на 17 месцаў), «тэхналогія лекавых прэпаратаў» (22 чалавекі на 15 месцаў), «выдавецкая справа» (59 чалавек на 32 месцы), «лясная гаспадарка» (16 чалавек на 10 месцаў) , «дызайн электронны і вэб-выданняў» (39 чалавек на 30 месцаў), «менеджмент» (57 чалавек на 34 месцы), «маркетынг» (38 чалавек на 25 месцаў), «праграмнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій» (70 чалавек на 50 месцаў), «ахова навакольнага асяроддзя» (15 чалавек на 10 месцаў) і на некаторых іншых.

Учора, 6 жніўня, ва ўсіх ВНУ адбылося залічэнне на платную форму навучання. Пажадаем, каб тым, каму ўсё ж пашчасціла ўскочыць у апошні вагон і стаць студэнтам, хапіла ведаў на тое, каб навучацца і не быць адлічаным пасля першай жа сесіі...

■ Нясумнае лета

# Як стварыць уласны YouTube-канал?

## У IT-лагеры МТС завяршылася першая змена

**Сумесны праект Міністэрства адукацыі і мабільнага аператара рэалізуецца гэтым летам на базе дзіцячага аздараўленчага лагера «Гарызонт» у Радашковічах. На працягу дзвюх змен для дзяцей тут арганізуюцца бясплатныя заняткі, якія праводзяць выкладчыкі Адукацыйнага цэнтра ПВТ.**

Летась падлеткі вучыліся ў IT-лагеры праграмаваць гульні на мове Scratch і падрыхтавалі больш як 300 уласных праектаў. Гэтым разам было вырашана зрабіць упор на стварэнні разнастайнага ўнікальнага кантэнту.

У праграме першай змены было чатыры кірункі: «Асновы робататэхнікі», «Робататэхніка: датчыкі і праграмы», «Відэаблогінг» і «Мабілаграфія». Два тыдні школьнікі вучыліся праграмаваць, мадэліраваць робатаў, рабіць мастацкія фота і здымаць відэаролікі. За час IT-канікул дзеці даведаліся, для чаго і дзе прымяняецца робататэхніка, стварылі каля двух дзясяткаў уласных мадэляў робатаў. Школьнікі прайшлі курс па асновах фатаграфіі: навучыліся працаваць з кампазіцыяй, святлом і апрацоўваць фота з дапамогай праграм на смартфонах. Акрамя таго, выхаванцы летніка атрымалі веды па здымцы і мантажы відэаролікаў і стварылі ўласныя YouTube-каналы.

Заняткі былі разлічаны на дзяцей і падлеткаў ва ўзросце ад 6 да 17 гадоў. Трапіць на бясплатныя курсы змаглі ўсе, хто прыехаў у «Гарызонт» па пуцёўцы. Пасля заканчэння навучання слухачы курсаў атрымалі пасведчанні Адукацыйнага цэнтра ПВТ і памятныя падарункі.



Праект «IT-лагер» рэалізуюць сумесна Міністэрства адукацыі і кампанія МТС у рамках заключанага пагаднення аб супрацоўніцтве. Партнёрам выступае Адукацыйны цэнтр ПВТ. Другая змена стартуе ў IT-лагеры 7 жніўня.

**Матэрыялы падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА.**



# «МУЖ ПРЫВУЧАЎ МЯНЕ ДА ПЧОЛ ПАСТУПОВА...»

## КАЛІ ЗАГУЛА «ПЧОЛКА»

Адкуль з'явілася такое захапленне, Міхаіл і сам дакладна не можа сказаць. Ніхто з родзічаў пчалярствам не займаўся. Па камсамольскай пуцёўцы вясковы хлопец паехаў будаваць Байкал-Амурскую магістраль, а пасля таго як развалiўся Савецкі саюз, вярнуўся на радзіму. Напэўна, тады прыйшла думка пра ўласны пчальнік, які стаў справай жыцця.

Калі нешта падабаецца, то робіш гэта з душой і хочаш падзяліцца з іншымі. Міхаіл далучыў да пчалярскай справы сыноў, жонку, а потым свята на Мядовы спас стала брэндам мясціны, дзе жыве руплівы пчалавод. Штогод у Прудніках — вёсачцы Докшыцкага раёна Віцебскай вобласці — збіраюцца пчаляры і аматары прыроднага ласунку. Ладзяцца канцэрт, гульні і конкурсы, частаванне мядовымі прысмакамі. Дзякуючы добраму прыкладу цяпер і на іншых падвор'ях раёна гудуць пчаліныя раі...

Вольга Радзюк-Сідзіна працуе дырэктарам Прудніцкага сельскага Дома культуры. Жанчына жартуе, што яны з мужам «наймаюць» адно аднаго. На пчальніку яна «на паўстаўкі» дапамагае мужу, а ў розных конкурсах ды святах Міхаіл падтрымлівае аднавяскоўцаў ігрой на гармоніку.

— За кожным клубам павінен быць замацаваны брэнд — нейкае мерапрыемства, каб прасоўваць мясцовасць. Мы з мужам пачалі шукаць, чым жа такім асаблівым нашы Пруднікі вылучаюцца. Думалі-думалі, ажно пакуль наш кіраўнік з раёна не здзівілася: «Дык у вас жа ўжо мядовае свята існуе!» — успамінае Вольга.

Так Дом культуры стаў яшчэ і базай для збору клуба пчалаводаў і аматараў мёду «Залатая пчолка». Удзельнікі прызнаюцца, што некаторыя з іх прыходзілі ў ДК яшчэ да стварэння «Пчолкі» — спяваць у музычным калектыве. Песні нікуды не зніклі, а вось тэматычная накіраванасць у клуба з'явілася, як і папка, куды дырэктар дадае граматы і ўзнагароды калектыву.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Удзельнікі клуба збіраюцца двойчы на тыдзень на паўтары-дзве гадзіны. Летам, калі для медазбору наступае «гарачая пара», сустрэча можа цягнуцца за поўнач, бо трэба хутка спарадкаваць салодкі прадукт.

— Яшчэ мае бацькі — што мама, што тата — займаліся пчоламі. У школе наступалі канікулы, і мы малыя за восем кіламетраў ішлі да бабкі ў Гліннае. Звыклых «дамкоў»-вулляў тады не было, рой жыў у калодах — «карэннікáх», як іх тут называлі. Цяпер ужо няма ні бабулі, ні вёскі, дзе яна жыла, а гаспадары трымаюцца за традыцыю, ставяць у сваіх дварах хоць з пяток вулляў, — кажа ўдзельніца клуба Галіна Юльянаўна Паўловіч.

Калектыў умоўна можна раздзяліць на дзве часткі: дарослую і дзіцячую. Калі навенькага ўсур'ёз зацікавіць «салодкая справа», ён пачынае вучыцца на прыкладзе старэйшых. Зімою набіраецца тэорыі ў кнігах, а летам разам з Міхаілам Іванавічам праходзіць «практыку» сярод вулляў. Нядаўна быў выпадак, калі хлопец так загарэўся рамствам, што здолеў далучыць да захаплення яшчэ і бацьку, так што цяпер сям'я Анішчык «пасвіць» на кветкавых лугах свае сем пчаліных сем'яў.



Сям'я Радзюкоў-Сідзіных паказвае, як выдаляюць мёд з сотаў.

## АДЗІН ГАСПАДАР НА 180 СЕМ'ЯЎ

Насамрэч работа пчаляра нялёгкая. Многія пачынаюць, але гадамі трымаць вуллі застаюцца толькі тыя, хто моцна «захварэў» на справу.

Міхаіл працуе з пчоламі дваццаць сёмы сезон. Напачатку спрабаваў прызвычаіцца да работы ў падсобнай гаспадарцы, але не спадабалася стаўленне да работнікаў. Перайшоў у аграсэрвіс. Тое самае. Урэшце мужчына вырашыў заставацца толькі аматарам і жыць са «сваёй» пасекі. Тым часам у Прудніцкім лясніцтве здарылася няшчасце — за зіму загінуў цэлы пчальнік. Дырэктар лясгаса папрасіў дапамогі ў абазнанага пчаляра. Міхаіл пагадзіўся аднавіць справу і за год спрацаваўся з леснікамі. Кажа, падкупіла стаўленне як работнікаў, так і начальства. Зімой арганізацыя забяспечвае драўнінай, каб можна было майстраваць рамкі і домікі. Леснікі, калі бачаць, што працы замнога, прапануюць дапамогу.



Сярод удзельнікаў «Залатой пчолкі» ёсць дарослыя пчаляры, нашчадкі пчалярскіх дынастый, і маладыя памочнікі, якія пакуль толькі прыглядаюцца да рамяства.

Цяпер на пчальніку побач з лясніцтвам 85 пастаянных «зімніх» пчаліных дамкоў. Яшчэ каля 60 сем'яў знаходзяцца ў летніках — гэта такія пераносныя вуллі, каб пчолы маглі збіраць нектар побач з квітнеючым полем. А ўсяго пад доглядам прудніцкага пчаляра знаходзіцца 180 сем'яў.

«Адчуваеце, які пах?» — пытаецца Вольга.

Паветра на пчальніку сапраўды п'яніць летнімі водарамі кветак, хвоі і мёду. Міхаіл тым часам апранае спецыяльны касцюм, распальвае дымар і падыходзіць да першага дамка.

— Выдаляем мёд цяпер з-за таго, што ў соты трапіў рапс (матэрыял рыхтаваўся ў час цвіцення гэтай расліны. — **Аўт.**), — тлумачыць пчаляр. — Рапсавы мёд лічыцца самым лепшым па колькасці глюкозы, яе там каля 60 працэнтаў. У Еўропе яго вельмі высока цэняць, але ў нас ён не карыстаецца папулярнасцю, бо па колеры белаваты і мае спецыфічны водар. Акрамя таго, надзвычай хутка крышталізуецца. Для пчалінай сям'і гэта асабліва небяспечная, бо, калі такі прадукт пакінуць на зіму, насякомыя не змогуць ім харчавацца. Таму выбіраем рапсавы мёд незалежна ад колькасці — хай бы і паўкілаграма.

Пчаляр здымае з вулля дах, акурвае кораб унутры дымам. Нават у ахоўным касцюме стаяць побач з растрывожаным роем няўтульна. Аднак Міхаіл спакойна дастае рамкі неабароненымі рукамі, а асабліва ўпартых насякомых асцярожна адпіхвае пальцамі. Адначасова пчаляр аглядае соты, рамкі і расказвае пра сваіх улюбёнцаў. Звяртае ўвагу, ці паспелі насякомыя адраіцца, прыкідвае, якія шанцы ў сям'і добра падрыхтавацца да зімы, і нават наколькі яны «дружна» жывуць. Такое адчуванне, што гаворка ідзе пра суседзяў, маўляў, гэта сям'я ў нас маладая, але моцная, і з дабрабытам у яе ўсё ў парадку.

— Ёсць такая парода пчол — Бакфаст. Яны наогул на пчаляра не рэагуюць, займаюцца сваімі справамі. У мяне збольшага ў вуллях жывуць «карпаткі», таксама добрыя пчолкі, нязлосныя. У гэтай канкрэтнай сям'і ўсяго каля 10—15 тысяч пчол. А калі вулей стары, то там можа быць і да 45 тысяч жыхароў. Гэта цяпер я з імі знайшоў агульную мову, а ў першы час былі няўдачы. Памятаю, як спецыяльна прыходзіў глядзець і слухаць, як пчолы гудуць каля лятка. Ды і цяпер люблю прылегчы побач з вуллем.

## У РАМСТВЕ НЯМА ВЫПАДКОВЫХ ЛЮДЗЕЙ

Каб здабыць з сотаў мёд, іх трэба спачатку распячатаць. Вольга счэсвае «накрыўкі» і аднaчасова расказвае пра сябе:

— З самага пачатку ведала, што выходжу замуж за пчаляра. Міша далучыў да справы сыноў, а я пчол баялася. Мужу прыйшлося быць цярплівым і вынаходлівым. Прывучаў паступова: «Воля, вось тут падтрымай, Воля, вось тут дапамажы...» А як уцягнулася ў работу, то нават падабаецца цяпер.

Летась, як кажуць пчаляры, год быў няўдалы на медазбор. У лясніцтва Міхаіл здаў 758 кілаграмаў прадукту. У спрыяльнае надвор'е ўраджай у пчалавода можа «заскочыць» за тону.

Пакуль чакаем, калі ласунак нацячэ ў посуд, Міхаіл расказвае пра некаторыя застарэлыя міфы з пчалярскай справы і прыадкрывае сакрэт, як выбраць «правільны» мёд і не нарвацца на махляра.

— У Беларусі, лічы, няма сталага рынку збыту. Пчаляры рэалізуюць прадукцыю хто як можа. Гэта складана і нязручна, але ў той жа час выбракоўвае з рамяства ўсіх павярхоўных людзей. Так што калі гаварыць наўскідку, працэнтаў 80 прадаўцоў прапануюць якасны мёд, бо ўлюбёныя ў справу. Хочаце ведаць, што атрымалі на стол, — паглядзіце на пчальнік прадаўца. Калі дамкі дагледжаныя, значыць, і чалавек ставіцца сумленна да занятку. А калі замест вулляў адны гнілякі — то гаспадару цікавыя не пчолы, а грошы. Адрозніць няякасны мёд «на вока» цяжка нават вопытнаму пчаляру, тут дапаможа толькі лабараторны аналіз.

Дарэчы, пчаляры ў мінулыя часы маглі быць першымі ўдалымі прадказальнікамі надвор'я. На змену атмасфернага ціску звычайна рахманыя пчолы становяцца агрэсіўнымі, так што лепш не праходжвацца побач з вуллямі перад даждом.

У шкляным посудзе свежы мёд нагадвае каштоўны бурштын. Гэта ўраджай з майскай квецені яблыневых і вішнёвых садоў. А ўсяго ў ласунку больш дзясятка розных гатункаў: кіпрэйны, дзьмухаўцовы, крушынавы, малінавы, з белай канюшыны... Восенню ў вуллях з'яўляецца нават верасовы мёд. Канешне, пчале не загадаеш, на якую кветку ёй цяпер садзіцца. Яна выбірае расліны, дзе многа густога нектару, так што, нават калі паставіць вулей побач з полем, усё роўна ў выніку атрымаецца сумесь з адным асноўным меданосам.

Зрэшты, галоўнае, каб табе падабаўся абраны занятак, а ліпавы мёд на стале ці грэцкі — ужо справа густу.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.**



Духмяны ласунак на стале.

## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Узденского райпо (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже недвижимого имущества:

**Лот 1: здание магазина общей площадью 87,0 кв. м, регистрационное удостоверение от 04.05.1999 № 5643, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 625683205101000027, площадью 0,0771 га** (предоставлен на праве постоянного пользования) **по адресу: Минская область, Узденский район, Слободской с/с, д. Каменое.**

Начальная цена с НДС – **3 184,70** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – 318,00 бел. руб.). **Стоимость снижена на 76 %.**

**Лот 2: здание магазина общей площадью 112,0 кв. м, регистрационное удостоверение от 04.05.1999 № 5649, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 625683208201000070, площадью 0,0783 га** (предоставлен на праве постоянного пользования) **по адресу: Минская область, Узденский район, Слободской с/с, д. Старые Морги**.

Начальная цена с НДС – **2 044,49** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – 204,00 бел. руб.). **Стоимость снижена на 90 %.**

**Лот 3: здание магазина «Продукты № 2» (с пристройкой, теневым навесом, сараем и гаражом) общей площадью 122,3 кв. м, инв. № 623/С-58206, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 625650100001000601 площадью 0,0831 га** (предоставлен на праве постоянного пользования) **по адресу: Минская область, Узденский район, г. Узда, ул. Полесская, 31.** *На земельном участке имеются ограничения прав в использовании: охранная зона электрических сетей площадью 0,0014 га.*

Начальная цена с НДС (20 %) – **42 420,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – 4 242,00 бел. руб.). **Стоимость снижена на 30 %.**

**Лот 4: здание магазина (с теневым навесом) общей площадью 85,4 кв. м, инв. № 623/С-58469, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 625650100001000081** (предоставлен на праве постоянного пользования) **площадью 0,0485 га, по адресу: Минская область, Узденский район, г. Узда, ул. Полесская, 31/1.**

Начальная цена с НДС – **16 740,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – 1 674,00 бел. руб.). **Стоимость снижена на 50 %.**

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 20 (двадцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов и возмещает затраты на организацию и проведение результативного аукциона в следующем размере: по лотам №№ 1, 2 – 10 (десять) процентов, по лоту № 3 – 5 (пять) процентов, по лоту № 4 – 7 (семь) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущее извещение по лотам №№ 1, 2 опубликовано в газете «Звязда» от 13.06.2018, по лотам №№ 3, 4 – в газете «Звязда» от 15.05.2018. Аукцион состоится **20.08.2018** в **11.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **17.08.2018** до **11.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении Лепельским районным исполнительным комитетом конкурса на предоставление права аренды рыболовных угодий, расположенных на территории Лепельского района Витебской области

| № лота | Наименование предмета торгов | Площадь, га | Тип, класс, категория | Направление деятельности | Месторасположение рыболовного угодья | Срок аренды, лет | Сумма ежегодной арендной платы, рублей | Сумма задатка в размере 20 % от суммы ежегодной арендной платы, рублей |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Право аренды озера Вокзино (Окзино) | 66,0 | Лещево – щучье – плотвичный | Ведение промыслового рыболовства и организации платного любительского рыболовства | 28 км на северо-восток от г. лепеля, у дер. Суша | 25 | 323,4 | 64,68 |

ОРГАНИЗАТОР – Лепельский районный исполнительный комитет, 211174, Витебская область, г. Лепель, пл. Свободы, д. 6, контактный телефон (02132) 6 70 22, факс 4 14 86, интернет-сайт lepelrik@yandex. by

АРЕНДОДАТЕЛЬ – Витебский областной исполнительный комитет, 210010, г. Витебск, ул. Гоголя, д. 6, контактный телефон (0212) 35 93 32.

1. Конкурс состоится 11 сентября 2018 г. в 14.00 по адресу: 211174, Витебская область, г. Лепель, пл. Свободы, д. 6, каб. 220.

2. Для участия в конкурсе приглашаются юридические лица. Участникам конкурса не позднее 7 сентября 2018 года необходимо в адрес организатора предоставить следующие документы:

заявление, в котором указываются сведения о рыболовных угодьях, которые участник торгов желает получить в аренду по результатам торгов.

**К заявлению прилагаются:**

– комплексный план использования рыболовных угодий (далее – комплексный план), разработанный в соответствии с требованиями к его содержанию и форме, установленными Советом Министров Республики Беларусь, или его копия, запечатанные в отдельном конверте;

– письменные предложения участников конкурса о выполнении условий конкурса, запечатанные в отдельном конверте. При этом данные предложения являются окончательными и не могут уточняться в ходе проведения конкурса;

– копия платежного поручения, квитанции или иного документа, подтверждающего внесение задатка;

– доверенность представителя участника конкурса и копия документа, подтверждающего его личность (в случае, если заявление подписывается не руководителем участника конкурса), либо копия документа, подтверждающего полномочия руководителя участника конкурса.

3. Документы, необходимые для участия в конкурсе, принимаются организатором конкурса по адресу: 211174, Витебская область, г. Лепель, пл. Свободы, д. 6, каб. 220, с 8.00 до 13.00, с 14.00 до 17.00 в рабочие дни.

4. Последний день приема документов – 7 сентября 2018 г. до 17.00. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются.

5. Сумма задатка перечисляется до подачи заявления на участие в конкурсе на расчетный счет: ***BY68 AKBB 3604 3190 0102 5210 0000, в ЦБУ № 211 ф-ла 216 ОАО «АСБ Беларусбанк», BIC AKBBBY21216 УНП300039625, ОКПО 040626632000.***

6. Конкурс проводится в порядке, определенном Правилами ведения рыболовного хозяйства и рыболовства, утвержденными Указом Президента Республики Беларусь от 8 декабря 2005 г. № 580 «О некоторых мерах по повышению эффективности ведения охотничьего хозяйства и рыбохозяйственной деятельности, совершенствованию государственного управления ими», Положением о порядке проведения конкурса по предоставлению в аренду рыболовных угодий фонда запаса, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 29.12.2017 года № 1044.

7. Победителем конкурса считается участник, который представит лучшие предложения по выполнению условий конкурса, которые должны отвечать следующим требованиям:

– Создание новых рабочих мест;

– Вложение инвестиций;

– Обустройство береговой линии, установка аншлагов к каждому подъезду озера, знака водоохранной зоны и прибрежной полосы, создание благоприятных условий для осуществления платного любительского лова рыбы: строительство дома охотника и рыболова на 20 мест (до 1,6 лет); установка беседок в количестве не менее 3 шт. (в течение года); установка мостиков для ловли рыбы – 5 шт. (не более 6 месяцев); обустройство лодочных станций – 1 шт. (не более 6 месяцев); установка биотуалетов – не менее 2 шт. (по схеме размещения объектов благоустройства территории);

– Предоставление льготных условий на осуществление платного любительского рыболовства для зарегистрированных по месту жительства граждан в д. Суша и д. Загорцы, Лепельского района.

8. Организатор конкурса вправе отказаться от торгов не позднее, чем за 30 дней до их проведения. Участник конкурса имеет право до наступления даты проведения конкурса письменно отозвать заявление.

9. Конкурс проводится при наличии заявлений двух и более участников.

В случае если заявление подано только одним участником и его предложения соответствуют условиям конкурса, заключение договора аренды рыболовных угодий осуществляется с этим участником конкурса на предложенных им условиях.

Участникам конкурса, не признанным победителями конкурса, задаток возвращается исполнительным комитетом в течение пяти рабочих дней после даты проведения конкурса.

Победителю конкурса, его единственному участнику сумма внесенного задатка учитывается в счет исполнения обязательств по договору аренды рыболовных угодий, заключаемому по результатам конкурса, при плате за рыболовные угодья.

10. Возмещение исполнительному комитету затрат на организацию и проведение конкурса, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам торгов документации, необходимой для его проведения, осуществляется победителем конкурса, его единственным участником. Размер такого возмещения не должен превышать суммы фактических затрат на организацию и проведение конкурса, изготовление документации, необходимой для его проведения.

Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения будет доведена до сведения участников конкурса до начала их проведения.

11. Контактная информация секретаря комиссии по организации и проведению конкурса по предоставлению в аренду рыболовных угодий фонда запаса: тел. 8 (02132) 6 70 22, эл. почта tat.chues@yandex.ru, адрес: 211174, г. Лепель, ул. Ленинская, 6, каб. 220.

## Извещение о повторном аукционе 24 августа 2018 г. по продаже объектов недвижимости в г. Пинске

| Наименование объекта | Изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-54077 «Цех строительных металлоконструкций» | Изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-50656 «Административное помещение с коммуникациями» | Капитальное строение с инвентарным номером 130/С-46622 «Здание компрессорной с ремонтно-механическим участком, цех доборных изделий |
|---|---|---|---|
| Номер лота | 1 | 2 | 3 |
| Местонахождение объекта | г. Пинск, ул. Калиновского, 11И-1 | г. Пинск, ул. Калиновского, 11-1 | г. Пинск, ул. Калиновского, 11У |
| Тип помещения | Совмещенное с другим изолированным помещением | Совмещенное с другим изолированным помещением | Отдельно стоящее |
| Общая площадь (кв. м) | 3982,2 | 3482,1 | 1930,1 |
| Площадь земельного участка для обслуживания строения (га) | 1,444 | | 0,3941 |
| Начальная цена продажи | 147 734,93 | 66 546,46 | 341 298,70 |
| Шаг аукциона | 5 % от начальной цены | 5 % от начальной цены | 5 % от начальной цены |
| Сумма задатка | 14 773,49 | 6 654,65 | 34 129,87 |
| Условия продажи | Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством | Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством | Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством |
| Характеристика объекта, площадь земельного участка (кв. м), решение об отводе земельного участка | Одноэтажное, состоит из 3 пролетов площадью 3982,2 кв. м. В состав входит: покрасочное отделение с локальными очистными сооружениями, водопроводная сеть – 127,4 м, канализация фекальная – 91,5 м, ливневая канализация – 143,4 м, линия электропередачи – 593 м, беседка, бетонное покрытие – 2290,2 кв. м. Ввод в эксплуатацию – 1973 г. | Здание трехэтажное с внутренними собственными коммуникациями (водопроводная, канализационная сеть, линия электропередачи). Имеется отопление (собственная котельная) Ввод в эксплуатацию – 1971 г. | Одноэтажное. Состоит: здание компрессорной 306 кв. м, помещение ремонтно-механического участка 294 кв. м, помещение цеха доборных изделий 1456 кв. м, пристройка 12 кв. м, навес 24 кв. м, градирня 33 кв. м, два теневых навеса 7 кв. м. Покрытие бетонное 1030 кв. м. Ввод в эксплуатацию – 1970 г. |

| Наименование объекта | Изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-58323 «Помещение арматурного цеха» | Изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-58322 «Помещение формовочного цеха с эстакадой для принятия бетона» | Комплекс зданий и сооружений (помещение формовочного цеха, арматурного цеха с бетоносмесительным центом с инвентарным номером 130D-58321; склад готовой продукции с инвентарным номером 130/С-44660; очистные сооружения с инвентарным номером 130С-44951; комплект гаражей с инвентарным номером 130/С-44658; железнодорожный путь с инвентарным номером 130/С-44660) |
|---|---|---|---|
| Номер лота | 4 | 5 | 6 |
| Местонахождение объекта | г. Пинск, ул. Калиновского, 11/1-3 | г. Пинск, ул. Калиновского, 11/1-2 | г. Пинск, ул. Калиновского, 11/1-1 |
| Тип помещения | Совмещенное с другим изолированным помещением | Совмещенное с другим изолированным помещением | Совмещенное с другим изолированным помещением |
| Общая площадь (кв. м) | 3200,6 | 1944,40 | |
| Начальная цена продажи, рублей | 179 251,30 | 117 264, 27 | 653 256,72 |
| Шаг аукциона | 5 % от начальной цены | 5 % от начальной цены | 5 % от начальной цены |
| Сумма задатка, рублей | 17 925, 13 | 11 726, 43 | 65 325, 67 |
| Условия продажи | Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством | Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством | Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством |
| Сведения об объекте | Одноэтажное, состоит из 1 пролета. Длина: 131,84 п. м, ширина: 24,27 п. м;<br>Крыша (кровля): рулонные кровельные материалы; полы: бетон; централизованная система холодного водоснабжения и канализации; вентиляция с естественным побуждением.<br>Ввод в эксплуатацию – 1970 г. | Одноэтажное, состоит из 1 пролета. Длина: 131,9 п. м, ширина: 17,87 п. м;<br>Крыша (кровля): рулонные кровельные материалы; полы: бетон; вентиляция с естественным побуждением.<br>Ввод в эксплуатацию – 1970 г. | – помещение формовочного цеха, арматурного цеха с бетоносмесительным центром: площадь – 18 836,2 кв. м, в том числе здание арматурного цеха – 4230 кв. м, бетоносмесительный центр – 206 кв. м;<br>крыша (кровля): рулонные кровельные материалы; полы: бетон; централизованная система холодного водоснабжения и канализации; вентиляция с естественным побуждением.<br>Ввод в эксплуатацию – 1970 г.<br>– склад готовой продукции: площадь – 14347 кв. м, 4 пролета, (материал покрытия площадки: цементо-бетон, колонны железобетонные с металлическим каркасом). Ввод в эксплуатацию – 1973 г.<br>– здание очистных сооружений: площадь 205 кв. м, крыша (кровля): рулонные кровельные материалы; полы: бетон; централизованная система холодного водоснабжения и канализации; вентиляция с естественным побуждением.<br>– 2 (два) резервуара для воды: материал – бетон; наружная площадь: 108 кв. м; объем: 300 куб. м.<br>Ввод в эксплуатацию – 1994 г.<br>– комплект гаражей: площадь – 66,8 кв. м, одноэтажное, крыша (кровля): рулонная битумная; полы: бетон; вентиляция естественная. Ввод в эксплуатацию – 2010 г.;<br>– железнодорожный путь: протяженность – 3981,7 м. Ввод в эксплуатацию – 1971 г. |

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | Ликвидационная комиссия ОАО «Пинский КСИ», ТУП «ПриБут» |
| Продавец аукциона | Ликвидационная комиссия ОАО «Пинский КСИ», ТУП «ПриБут» |

Аукцион состоится **24 августа 2018 года в 11.00** по адресу: г. Пинск, ул. Калиновского, 11, в актовом зале ОАО «ПКСИ».

Перечень необходимых документов:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с ОАО «Пинским комбинатом строительной индустрии».

2. Заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка: на расчетный счет ОАО «Пинский комбинат строительной индустрии» р/счет BY16BAPB30124701200210000000 в ОАО «Белагропромбанк», г. Минск, БИК BAPBBY2X, УНП 200305504 , срок внесения суммы задатка – по 23 августа 2018 г. включительно.

3. Индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации и его подлинник для заверения его копии организатором торгов;

4. Юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица и их подлинники, для заверения их копий организатором торгов;

5. Представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также документ, подтверждающий его полномочия.

Организатор торгов имеет право отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три дня до даты его проведения.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену.

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан подписать протокол аукциона в день проведения аукциона; в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона возместить затраты на оценку, организацию и проведение аукциона; подписать договор купли-продажи недвижимого имущества в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Порядок проведения аукциона определен в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов.

**Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Пинск, ул. Калиновского, 11, каб. 2 с 9.00 до 15.00 по рабочим дням по 23 августа 2018 года включительно, тел 80165-37-16-19, тел./факс (80165) 37-16-66. Контактный телефон 375-29-640-80-37**

■ Тэндэнцыі

# НОВЫЯ СТАНДАРТЫ ПРОДАЖАЎ

## Вытворцы і распаўсюджвальнікі друкаваных СМІ абмеркавалі актуальныя маркетынгавыя падыходы



**Пытанні распаўсюджвання перыядычнага друку ва ўмовах развіцця лічбавых тэхналогій і абвастрэння канкурэнцыі абмеркавалі ў Доме прэсы. На сустрэчы падчас семінара-практыкума, арганізаванага Саюзам выдаўцоў і распаўсюджвальнікаў друку пры падтрымцы Міністэрства інфармацыі сабраліся прадстаўнікі аддзелаў продажаў і маркетынгу найбуйнейшых арганізацый па распаўсюджванні перыёдыкі і прадстаўнікі цэнтральных друкаваных СМІ. Яны абменьваліся вопытам, як зрабіць інфармацыю больш даступнай і выбудаваць эфектыўныя лагістычныя ланцужкі ад рэдакцыі да чытача.**

У сваім прывітальным слове **міністр інфармацыі Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ** адзначыў, што, нягледзячы на ўсе складанасці, рынак перыядычнага друку застаецца досыць ёмістым і будзе працягваць развівацца. Пацвярджэнне таму — агульны разавы тыраж беларускай прэсы, які складае больш за 9 млн экзэмпляраў. На думку міністра, сёння важна выбудаваць сучасны і эфектыўны рынак друкаванай прадукцыі ў краіне. Гэтага можна дасягнуць у больш цеснай і сумеснай рабоце распаўсюджвальнікаў і вытворцаў друкаваных СМІ.

Па словах **старшыні Саюза выдаўцоў і распаўсюджвальнікаў друку Ліліі АНАНІЧ,** цяпер у «Белсаюздруку» з'явіліся новыя канкурэнты ў выглядзе гандлёвых сетак. Яна нагадала, што ў былыя часы ўдзельная вага друкаванай прадукцыі ў тавараабароце «Белсаюздруку» была больш за 50 %. А каб у век інфармацыйных тэхналогій інавацыі служылі ў тым ліку і распаўсюджванню друку, іх неабходна эфектыўна выкарыстоўваць. Напрыклад, для адсочвання таго, што прадаецца сёння ў тым ці іншым рэгіёне.

**Намеснік дырэктара «Белсаюздрука» Святлана НІКАНАВА** адзначыла, што падзенне рынку перыядычных выданняў — агульнасусветная тэндэнцыя, якая працягваецца паўсюдна.

«Паводле ацэнак экспертаў, падзенне рынку носіць зацяжны характар і ў найбліжэйшыя некалькі гадоў не спыніцца. Асноўнымі прычынамі гэтага з'яўляюцца імклівы рост лічбавага сегмента, развіццё інтэрнэту, удасканаленне гаджэтаў і праграмнага забеспячэння. Адбываецца адток рэкламадаўцаў», — растлумачыла Святлана Ніканава.

Але разам з тым, паводле яе слоў, калі раней папяровая перыёдыка разлічвала выключна на дзяржпадтрымку, сёння ў выданняў ёсць імкненне выйсці за звыклыя рамкі, каб стаць бліжэйшымі да чытача і цікавейшымі для рэкламадаўцаў.

З пункту гледжання прадаўцоў перыёдыкі, палепшыць становішча спраў можа аб'яднанне буйных распаўсюджвальнікаў, што паменшыць лагістычныя выдаткі.

Так, на 1 студзеня 2018 года ў дзяржаўным рэестры выдаўцоў, вытворцаў і распаўсюджвальнікаў друкаваных выданняў краіны ў якасці распаўсюджвальнікаў зарэгістравана 1608 суб'ектаў гаспадарання. З іх 134 (8,3 %) — дзяржаўныя, а 1474 — (91,7 %) суб'екты недзяржаўнай формы ўласнасці. Каля 43,2 % ад агульнай колькасці распаўсюджвае друкаваную прадукцыю ў Мінску, 56,8 % — у абласцях.

Па словах намесніка дырэктара «Белсаюздрука», аб'яднаная гандлёвая сетка да канца года будзе налічваць каля 1200 аб'ектаў у Мінску і абласцях. У сетцы будзе адзіны пазнавальны стандарт.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ**

■ Будзь у курсе!

### З'явіцца цягнік «чатырох сталіц»

**Украінскі бок па ўзгадненні з чыгуначнымі адміністрацыямі Беларусі, Літвы і Латвіі ў рамках рэалізацыі пілотнага праекта з 28 верасня прызначыў цягнік «чатырох сталіц» № 31/32 Кіеў — Мінск — Вільнюс — Рыга, паведамілі ў прэс-цэнтры БЧ.**

Цягнік будзе адпраўляцца са станцыі Кіеў-Пасажырскі 28 верасня, 4, 12, 18, 26 кастрычніка, 2, 8, 16, 22, 30 лістапада і 6 снежня ў 13.42, прыбываць на станцыю Мінск-Пасажырскі ў 23.35 (час адпраўлення з нашай сталіцы — 0.02 наступных сутак), на станцыю Вільнюс — 4.25 (час адпраўлення 4.30), на канчатковую станцыю Рыга-Пасажырская цягнік прыбудзе ў 9.05.

Са станцыі Рыга-Пасажырская цягнік адправіцца 29 верасня, 5, 13,19, 27 кастрычніка, 3, 9, 17, 23 лістапада, 1 снежня і 7 снежня ў 11.10, у Вільнюс ён прыбудзе ў 15.48 (час адпраўлення з Вільнюса — 15.53), на станцыі Мінск-Пасажырскі цягнік спыніцца ў 20.17 (адпраўціца ў 20.47). На станцыю Кіеў-Пасажырскі новы цягнік будзе прыбываць у 6.42 30 верасня, 6, 14, 20, 28 кастрычніка, 4, 10, 18, 24 лістапада, 2 снежня і 8 снежня.

Рэалізацыя праязных дакументаў будзе ажыццяўляцца за 45 сутак да адпраўлення цягніка.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■ Прававая гасцёўня

# ЗДАЕШ КРОЎ — АТРЫМАЙ ГАРАНТЫІ

## Грошы, дадатковы выхадны і бясплатнае харчаванне для донараў

***— Я вырашыў стаць донарам і ўпершыню адправіўся здаваць кроў. На работу, вядома, не прыйшоў, бо чуў, што так можна рабіць. На наступны дзень начальнік прымусіў мяне пісаць тлумачальную запіску пра прычыну адсутнасці і паставіў за той дзень прагул. Ці меў ён на гэта права? І якія гарантыі ў такім выпадку маюць донары крыві, якія, як мне здаецца, робяць карысную для дзяржавы справу?***

**Міхаіл ЖВЫРКО,** *г. Лунінец.*

На пытанне адказвае **Сяргей ЕЛІСЕЕЎ, юрыст:**



— Калі вы не папярэдзілі наймальніка пра свой намер не пазней чым за два рабочыя дні да моманту здачы крыві, то ў яго былі ўсе падставы так зрабіць. Аднак на практыцы выкананне донарскай функцыі адносіцца да ўважлівых прычын адсутнасці на працоўным месцы. Так што, калі вы не папярэдзілі наймальніка за два рабочыя дні і не выйшлі на работу, а пасля прад'явілі даведку з медыцынскай установы аб здачы крыві, мяркую, звольніць вас за прагул не змогуць. Падстава для гэтага — адсутнасць на рабоце без уважлівых прычын.

Донары маюць пэўныя правы і гарантыі. Перш за ўсё, гэта **атрыманне грашовай кампенсацыі.** Чалавек можа выконваць донарскую функцыю з атрыманнем за здачу крыві, яе кампанентаў (далей — кроў) грашовай кампенсацыі (на платнай аснове) або без яе атрымання (на бязвыплатнай аснове) [(абз. 4-5 ч.1 арт. 29 Закона Рэспублікі Беларусь ад 30.11.2010 года № 197-З «Аб донарстве крыві і яе кампанентаў» (далей — Закон аб донарстве)].

Донар самастойна вызначае, атрымліваць яму грошы за здачу крыві ці не. Грашовая кампенсацыя выплачваецца донарам, якія здаюць кроў на платнай аснове (ч. 9 арт. 31 Закона аб донарстве). Арганізацыя пералівання крыві выплачвае грошы донару ў дзень здачы крыві [(абз. 2 падп. 1.5 п. 1 пастановы Савета Міністраў Беларусі ад 02.06.2011 года № 693 «Аб некаторых пытаннях, звязаных з донарствам крыві і яе кампанентаў» (далей — Пастанова № 693)].

Згодна з абз. 5 арт. 30, ч. 2 арт. 31, ч. 2 арт. 31-1 Закона аб донарстве, работнік вызваляецца ад работы ў дзень здачы крыві з захаваннем сярэдняга заробку. Пры гэтым ён павінен папярэдзіць наймальніка пра свой намер не пазней чым за два рабочыя дні. Выключэнне — толькі выкананне донарскай функцыі ў экстранным парадку ў мэтах захавання жыцця і здароўя рэцыпіента.

Больш за тое, **донару даецца дадатковы дзень адпачынку.** Такі дабавачны выхадны з захаваннем сярэдняга заробку належыць чалавеку пры выкананні донарскай функцыі на платнай аснове ў працоўны час (ч. 4 арт. 31 Закона аб донарстве). Калі кроў здаецца на бязвыплатнай аснове, то можна скарыстацца днём адпачынку без захавання сярэдняга заробку згодна ч. 5 арт. 31-1 Закона аб донарстве. Акрамя таго, дзень адпачынку можна далучыць да працоўнага водпуску (ч. 4 арт. 31, ч. 5 арт. 31-1 Закона аб донарстве).

Звяртаю вашу ўвагу, што ў выпадку выканання донарскай функцыі за грошы падчас працоўнага водпуску; у дзяржаўныя святы і святочныя дні, устаноўленыя і аб'яўленыя Прэзідэнтам Беларусі непрацоўнымі; у выхадныя дні або пасля працоўнага дня, работнік мае права выкарыстоўваць два дні адпачынку (ч. 3 арт. 31 Закона аб донарстве). Адзін з іх будзе без захавання сярэдняга заробку, другі — з захаваннем.

**У дзень здачы крыві донару выдаецца таксама бясплатнае харчаванне** згодна з ч. 9 арт. 31, ч. 4 арт. 31-1 Закона аб донарстве; ч. 1 падп. 1.2 п. 1 Пастановы № 693.

Перад здачай крыві донару прызначаецца правіянт на суму 2 % бюджэту пражытковага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва (БПМ). Пасля здачы — талон на харчаванне на суму 10 % БМП, які выдаецца ў арганізацыі пералівання крыві. Донар мае права адмовіцца ад талона на харчаванне і атрымаць замест яго грашовую кампенсацыю ў тым жа памеры — 10 % БМП.

**Дапамога па часовай непрацаздольнасці ў памеры 100 % прызначаецца донару з першага дня страты працаздольнасці.** Для яе атрымання неабходна, каб донар здаваў кроў (мужчыны — не менш за чатыры данацыі, жанчыны — не менш за тры), яе кампаненты (не менш за 14 данацый) на працягу 12 месяцаў, якія папярэднічаюць дню надыходу часовай непрацаздольнасці (ч. 10 арт. 31, ч. 7 арт. 31-1 Закона аб донарстве).

**Калі донар становіцца інвалідам** праз выкананне сваіх функцый па здачы крыві, **інваліднасць прызнаецца звязанай з няшчасным выпадкам на вытворчасці,** прафесійным захворваннем або выкананнем абавязкаў ваеннай службы (службы) (ч. 2 арт. 29 Закона аб донарстве).

Нагрудным знакам адрознення Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь «Ганаровы донар Рэспублікі Беларусь» узнагароджваюцца донары, якія:

— платна здалі кроў у памеры не менш за 40 данацый, а плазму, лейкацыты, трамбацыты — не менш за 80 (ч. 11 арт. 31 Закона аб донарстве);

— бясплатна здалі кроў у памеры не менш за 20 данацый, а плазму, лейкацыты, трамбацыты — не менш за 40 данацый (ч. 6 арт. 31-1 Закона аб донарстве).

**Узнагароджаныя знакам «Ганаровы донар Рэспублікі Беларусь» донары маюць дадатковыя гарантыі** (ч. 1 арт. 31-2 Закона аб донарстве):

пазачарговае абслугоўванне ў дзяржаўных установах аховы здароўя;

аказанне медыцынскай дапамогі ў ведамасных арганізацыях аховы здароўя, дзе яны абслугоўваліся падчас работы і пасля выхаду на пенсію;

працоўны водпуск у летні або іншы зручны час;

першачарговае набыццё білета на чыгуначны, паветраны, водны, аўтамабільны транспарты;

павышэнне пенсіі па дасягненні агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту ў адпаведнасці з заканадаўствам Беларусі аб пенсійным забеспячэнні.

*Шаноўныя чытачы, калі ў вас узніклі пытанні юрыдычнага характару, дасылайце іх на наш паштовы або электронны адрас sidarok@zviazda.by. У «Прававой гасцёўні» разам са спецыялістамі Мінюста і іншых ведамстваў мы будзем шукаць на іх адказы*

❍ Ад рэдакцыі

Зараз у краіне актыўна абмяркоўваецца пытанне па зменах у Закон аб донарстве, якія могуць зрабіць здачу крыві бязвыплатнай. За грошы, мяркуецца, будуць прымаць толькі яе кампаненты. Ужо летась кожная чацвёртая данацыя крыві ў Беларусі была бясплатнай. А да 2020 года плануюць зрабіць дармовымі ўсе такія данацыі.

Бязвыплатнае донарства — сусветная практыка. Лічыцца, што донары-альтруісты больш адказныя, яны шчыра гавораць пра стан свайго здароўя, і ў іх крыві менш інфекцый.

Першае грамадзянскае абмеркаванне законапраекта прайшло ў Рэспубліканскім навукова-практычным цэнтры трансфузіялогіі і медыцынскіх біятэхналогій.

Каб нейкім чынам кампенсаваць донарам здачу крыві, ім, напрыклад, плануецца выдаваць грошы на ежу або картку, сродкі з якой чалавек зможа патрацiць толькі на прадукты.

Прадугледжваецца і шэраг дадатковых ільгот: зніжка ў 25 % на платныя медпаслугі, штогадовая выплата ў памеры трох базавых велічынь.

# «Кожная вандроўка — як адкрыццё маленькага свету...»

## Культурная спадчына ад дываноў і караваяў да «каменных дзевачак»

**Кожны тыдзень Кацярына ВАДАНОСАВА ў эфіры канала «Беларусь 3» расказвае гледачам праграмы «Жывая культура» цікавінкі пра ўнікальныя беларускія рамёствы, абрады і культурныя традыцыі: як ткуцца дываны і вышываюцца ручнікі, як хаваюць стралу, танчаць Котчынскую кадрылю, выпякаюць знакамітыя мотальскія караваі... І гэта не проста пералік Нацыянальнага інвентару нематэрыяльнай культурнай спадчыны, а захапляльныя прыгоды. Што значыць выправіцца са сталіцы ў іншы свет і як знайсці правільную танальнасць, прадстаўляючы жывую народную культуру, Кацярына расказала «Звяздзе» ў эксклюзіўным інтэрв'ю.**


«Гэты мікрааўтобусік ужо стаў як дом родны: я ў ім і ела, і спала, і вышывала, і спявала, і нават панчохі цыравала».

***— Веткаўшчына, Тураўшчына, Мастоўшчына... Дзе яшчэ вы ўжо былі з вандроўкамі?***

— Усе адрасы так адразу і не прыгадаю. Звычайна адна камандзіроўка — гэта дзве праграмы, а ўсяго запланавана як мінімум 69 выпускаў, бо якраз столькі аб'ектаў знаходзяцца ў спісе нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі, і мы мусім ахапіць іх усе. Справа ў тым, што зараз лета і добрае надвор'е, таму мы хапаем гэта лета за хвост, каб паспець зрабіць прыгожую карцінку.

***— Як наогул вырашаеце, куды адправіцца наступным разам: па народным календары?***

— Так, сапраўды кіруемся календаром, бо некаторыя абрады прымеркаваныя да пэўнай даты — Юр'я, напрыклад, ці калядныя Цары, і мы не займаемся ўзвядзеннем пацёмкінскіх вёсак, а здымаем насамрэч тое, як усё адбываецца. А аб'екты, не звязаныя з пэўнай датай, адсочвае наш прадзюсар і кіруецца здаровым сэнсам: пракладвае маршрут так, каб месцы здымак знаходзіліся адносна недалёка адно ад аднаго, каб зручна было зняць адразу дзве праграмы.

***— Ці паўсюль ахвотна месцічы ідуць на кантакт?***

— Бывае вельмі па-рознаму: бывае так, што адмаўляюцца ад здымак, хоць мы іх папярэдне тыдзень упрошвалі; бывае, што ставяць свае сустрэчныя ўмовы. Але вельмі часта здараецца, што зусім выпадкова ідзём па вуліцы, сустракаем людзей — і яны запрашаюць нас у хаты, штосьці цікавае расказваюць, гатуюць, частуюць... Так, адным разам прыехалі здымаць пра традыцыйную кухню, а нам у апошні момант адмовілі — адна бабулька толькі пагадзілася расказаць, але не паказаць, як гатаваліся тыя смачныя стравы. І вось выходзім з яе хаты, ідзём па вуліцы ў роспачы — бачым, ідзе жанчына з капустай. Павіталіся, запыталіся, куды ідзе. Аказалася, да дачкі, рыхтавацца да мясцовага фэсту. Ну і запрасіла нас з сабой, і тут жа на месцы нам прадэманстравалі, як гатуюцца тыя аўтэнтычныя стравы... Так было не раз і не два, а амаль што ў кожнай камандзіроўцы такія неспадзяванкі.

***— Самае цікавае заўжды застаецца па-за кадрам. Якія сустрэчы і паездкі найбольш запалі ў памяць?***

— Звычайна пасля кожнай паездкі цягам некалькіх гадзін расказваю маме і дзецям свежыя ўражанні. Напэўна, час ужо засесці за дарожныя дзённікі. Бо, як бы пафасна гэта ні прагучала, кожная вандроўка — як адкрыццё маленькага свету, абсалютна адрознага ад таго, што мы перажываем тут, у Мінску. Я сустракала людзей, якія ніколі не былі не тое што ў сталіцы, а за межамі сваёй вёскі; жанчын, якія жывуць адны ў пакінутых вёсках, калі едзеш, і навігатар паказвае, што далей — нічога, дарогі няма. І яны расказваюць уражальныя рэчы: як хадзілі ў плузе, як сіротамі выжывалі ў пасляваенны час, як сёння, калі ім страшна ўзімку, распускаюць старыя шкарпэткі і робяць вышыўкі з ніткі; а ўсе хаты ў іх падобныя да музеяў. У гэта настолькі немагчыма паверыць сучаснаму жыхару — напрыклад, што ты прыязджаеш у Лельчыцкі раён, а там людзі дагэтуль пакланяюцца каменным ідалам, і гэтыя традыцыі абсалютна натуральныя, жывыя. Тая камандзіроўка, дарэчы, называлася «каменныя дзевачкі», я пачытала крыху ў інтэрнэце, але інфармацыі назбірала вельмі мала. Аказалася, што «дзевачкі» — гэта старажытныя каменныя крыжы, як на Тураўшчыне, яны стаяць у лесе або закінутым полі, у такім месцы, якое чужынец не знойдзе. На мой суб'ектыўны погляд — а я маю пэўны досвед, бо па адукацыі рэлігіязнаўца, — калісьці на гэтым месцы, хутчэй за ўсё, было язычніцкае капішча, потым прыйшло хрысціянства і з'явіліся крыжы, а людзі як пакланяліся ідалам, так і пакланяюцца дагэтуль. Крыжы называюць «дзевачкамі», яны маюць імя Ева; кажуць, што гэта дзяўчынкі, якіх праклялі іх маці напярэдадні навальніцы. І па сённяшні... І па сёння на кожнае свята жанчыны ходзяць да гэтых крыжоў і ахвяруюць ім хусткі, фартухі, упрыгожанні розныя — выглядае даволі страшна насамрэч, як стаіць гэты маленькі, каля 60 см у вышыню, крыж, цалкам абвешаны жаночымі рэчамі. І жанчыны не разумеюць, што па сутнасці спраўляюць язычніцкія абрады, яны перамяжаюць малітвы, жагнанні і песні з абсалютна рэліктавым зместам і лічаць, што ім дапамагае і Бог, і Ева. Зусім побач стаяць іконы, крыжы, капліцы — атрымліваецца такі вінегрэт, такі мікс-фікс, што, з'язджаючы адтуль, адчуваеш сябе літаральна экскурсантам у паралельны свет...Тая мясцовая атмасфера, якая ёсць у творах Караткевіча, — яна нікуды не падзелася, яна існуе дагэтуль, і гэта пераварочвае тваю свядомасць дагары нагамі.


«Сама спякла 14 (!) боханаў жытняга хлеба на заквасцы ў рускай печы! Пад кіраўніцтвам бабулі Сцепаніды з вёскі Дзеркаўшчына расчыняла хлеб на квасе ў старажытнай дзяжы, суткі чакала, глядзела, пільнавала, потым перамешвала, мясіла, мыла жалезныя формы, мазала, рабіла на цесце крыж, загладжвала дзяжу і цеста, паліла печ, грэбла вуголле, вілкамі ставіла формы, качэргай вымала, апякла палец, і гэтак далей, і гэтак далей, і ўсё на камеру, і ўсё з усмешкай...»

Я даволі скептычны чалавек, які не верыць у забабоны і добра разумее розніцу паміж прымхамі і нейкімі містычнымі праявамі, таму гэткіх рэчаў, пра якія можна сказаць «суцэльная містыка», на жаль ці на шчасце, з намі не здаралася. Але, з іншага боку, амаль кожная наша камандзіроўка на пэўным этапе знаходзіцца пад пагрозай зрыву — і кожны раз літаральна нідкуль знаходзіцца выйсце. Як кажа наша прадзюсарка, «гэта нам Бог дапамагае» — мо, яно сапраўды так?

***— Адна з пагрозаў знікнення нематэрыяльнай культурнай спадчыны — адсутнасць пераемнасці пакаленняў, міграцыя моладзі. Падчас вандровак як вы ўбачылі, шмат дзе гэтая пагроза стаіць ужо востра?***

— Ёсць такія абрады, захавальніцамі якіх засталіся літаральна тры-чатыры бабулі. Але гэтым абрадам пашанцавала: яны ўжо знаходзяцца ў спісе наматэрыяльнай культурнай спадчыны, то-бок падтрымліваюцца на дзяржаўным узроўні. Прычым не магу сказаць, што падтрымліваюцца штучна. Канешне, ёсць нейкія захады з боку сельсавета, каб захаваць абрады і традыцыі — візітоўкі раёна. Дзенідзе ёсць пытанні ў тым, каб выхаваць новых носьбітаў культурнай традыцыі. Але многім людзям і самім цікава пераймаць іх, асабліва гэта датычыцца рамёстваў. Можа быць, я занадта аптымістычна гляджу ў будучыню, але спадзяюся, што ўсё гэта будзе існаваць надалей, а наша задача — паспрыяць захаванню традыцый.

Дарэчы, усе рамёствы і традыцыі, пра якія расказвае «Жывая культура», тэлевядучая абавязкова выпрабоўвае і сама. Тым больш, шмат якія рэчы няўрымслівая творчая дзяўчына сама добра ведае і любіць. Кацярына, доўгі час займаючыся гістарычнай рэканструкцыяй, умее ткаць на розных прыладах, ведае розныя тэхнікі мастацкай вышыўкі, уключаючы гістарычную, іграе на шэрагу інструментаў і прафесійна спявае, мае адукацыю гісторыка-рэлігіязнаўцы, а таму разумее гісторыка-культуралагічную падаплёку абрадаў.

Гаварыць пра народныя традыцыі і культуру без залішняга пафасу, спалучаць даследчыцкія і нават навуковыя моманты з натуральнай цікавасцю і душэўнасцю размовы — справа насамрэч не такая лёгкая, як можа здавацца. «Мы ж не этнографы, якія збіраюць матэрыял падчас экспедыцыі, трэба паказаць нематэрыяльныя каштоўнасці гледачам, па-першае, цікава, па-другое, прыгожа, і па-трэцяе, не выйсці за хранаметраж і фармат праграмы, — разважае Кацярына. — Заўсёды даводзіцца балансаваць паміж тэлевізійным падыходам і чалавечым стаўленнем да таго, што мы здымаем. Мне часам бывае няёмка ад таго, што я са сваім нафарбаваным тварам лезу ў сусвет вясковай бабулькі, распытваю яе пра ўсе жыццёвыя падрабязнасці. І таму даводзіцца тлумачыць, што нікога з герояў я не хачу пакрыўдзіць, што прыехала ў спадніцы ў мясцовасць, дзе ўсе ратуюцца ад камароў кофтамі і штанамі, не таму, што я такая фіфа, а таму, што гэтага вымагае фармат. Эмацыянальна гэта вельмі цяжка, і з кожнай камандзіроўкі я прыязджаю выціснутая дашчэнту. Але, з іншага боку, мне пашанцавала весці праграму, матэрыял якой для мяне самой вельмі важны і цікавы: я люблю сваю краіну і не хачу, каб тое, чым яна адметная, знікла ў часе і прасторы».


Слава пра неглюбскія ручнікі разышлася з Веткаўскага раёна па ўсім свеце. Як мяркуюць даследчыкі, гэтым узорам ужо некалькі тысяч гадоў.



«Гэта Мая, ёй 8 гадоў. У бабулінай вёсцы Данілевічы ўсе лічаць яе «сваёй», і яна таксама верыць у «каменных дзевачак», шкадуе іх, прыносіць свае цацкі, называе сяброўкамі і кажа, што дзясяткі фартухоў і хустак надзяваюць на іх, каб тыя ўзімку не мерзлі. У мяне Мая ўчарэпілася зранку, і мы хадзілі разам да позняга вечара, скрозь усе здымкі: і гулялі, смяяліся, перашкаджалі гукааператару, казыталіся, умываліся, зашывалі панчохі, хавалі дохлага жука...»

Акрамя душэўных перажыванняў, бывае няпроста і фізічна. Напрыклад, аднойчы вядучую так моцна пакусалі камары і мошкі, што давялося тэрмінова ехаць у шпіталь і рабіць укол, каб пазбавіцца анафілактычнага шоку. Іншым разам Кацярына напрацавалася каля печы — за суткі замясіла і выпекла 14 боханаў жытняга хлеба — ажно да млоснасці. Але нягледзячы ні на якія выпрабаванні, яна захоўвае роўны прыязны настрой і асаблівае, далікатна-беражлівае стаўленне да спадчыны ды яе носьбітаў.

***— Праграма, па сутнасці, толькі нядаўна пачалася. І ўсё ж — задумваліся над тым, што будзе далей?***

— У нас шмат прымхлівых людзей, і пакуль не абмяркоўваем, што будзе, калі скончыцца праграма — лепш думаць, што яна не скончыцца ніколі, — смяецца Кацярына. — Але пэўныя вынікі бачныя ўжо цяпер. Напрыклад, хоць мы і вымушаны крыху прафанізаваць, спрашчаць увесь матэрыял, каб ён быў цікавы нават недасведчаным людзям, я бачу па коле сваіх сяброў, якія сур'ёзна займаюцца гістарычнымі і этнаграфічнымі даследаваннямі, што праект зацікавіў і іх таксама. Прызнанне прафесіяналаў — гэта безумоўна важна. Мне ўжо тэлефануюць і пішуць (чаму мне, а не рэжысёру ці прадзюсару — загадка) з просьбай ладзіць творчыя сустрэчы і лекцыі, просяць, каб нашы праграмы ўваходзілі ў базы, якія назапашваюць мясцовыя этнаграфічныя таварыствы, навучальныя ўстановы і гэтак далей. А значыць, справа, якую мы робім, патрэбная іншым.

**Гутарыла Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
**Фота з асабістага архіва Кацярыны ВАДАНОСАВАЙ.**

Пантэон Айчыны

# Мікалай Радзівіл Руды

*(1512 — 27.04.1584)*



Гэты «хрестианский, справедливый и цнотливый пан», як казалі пра Мікалая Радзівіла па мянушцы Руды сучаснікі, меў дачыненне да кожнай значнай падзеі ў гісторыі Вялікага Княства Літоўскага сярэдзіны XVI стагоддзя. Польскі паэт Францішак Градоўскі ўсхвалёвана пісаў пра славутага гетмана з Літвы: «Нават калі б у мяне было сто языкоў і сто вуснаў, жалезны голас, я не змог бы пералічыць усе бітвы, якія вёў гэты пераможца з узнятым мячом па варожых палях». Мікалай Руды са славай працягнуў ваенную традыцыю свайго бацькі вялікага гетмана Юрыя Радзівіла, якога за шматлікія перамогі над ворагам назвалі Літоўскім Геркулесам. Родны брат каралевы Барбары Радзівіл, ён адыгрываў важную ролю і ў дзяржаўным жыцці ВКЛ.

Самую бліскучую перамогу Мікалай Руды атрымаў у бітве з маскоўскім войскам на рацэ Уле. Пасля заваёвы Полацка ў 1563 годзе Іван Грозны на пачатку 1564-га рушыў на ВКЛ дзве раці. Першая ў 20 тысяч вояроў выйшла з Полацка, а другая, 50-тысячная, выступіла з Вязьмы, і каля Оршы яны мусілі злучыцца, а пасля ісці ўглыб Літвы аж да Вільні, аваладаўшы па дарозе Менскам і Навагрудкам. Відавочна, што цар хацеў заваяваць Літву. Гэта быў адзін з самых небяспечных перыядаў у гісторыі ВКЛ. У гэты час польская шляхта і панства дамагаліся ад караля і адначасова вялікага князя літоўскага Жыгімонта Аўгуста далучэння ВКЛ да Польскага Каралеўства. І адгэтуль, і адтуль Літве пагражала знішчэнне яе дзяржаўнага суверэнітэту. Той самы момант, калі правадыр войска ВКЛ не меў права на памылку, а тым больш на паражэнне.

Вялікі гетман Мікалай Руды на чале шасці тысяч воінаў выступіў насустрач ворагу — раці на чале з ваяводам князем Пятром Шуйскім. «І хаця ў параўнанні з непрыяцелем я быў слабы, але сорам і ганьба, што выпалі мне і ўсяму нашаму народу і нашаму імені забраннем у нас горада і вобласці Полацкай, заахвоцілі мяне выступіць супраць ворага і паблізу самой Улы сустрэцца з ім твар у твар, што і адбылося ў сераду 26 студзеня», — успамінаў Мікалай Руды. Ягонае войска смела атакавала ворага. Радзівіл умелымі манеўрамі і своечасовымі падмацаваннямі не даваў магчымасці непрыяцелю дабіцца поспеху ні на адным з участкаў бітвы. Доўгі час ні адзін з бакоў не меў перавагі. Вырашальнымі ў гэтай бітве сталі баявы дух і мужнасць ліцвінаў — яны змагаліся за Радзіму. Ліцвіны «мужнасцю сваёй збілі непрыяцеля з месца». З набліжэннем цемры вораг не вытрымаў і пабег з поля сечы. Сам Пётр Шуйскі ратаваўся ўцёкамі, але і ён загінуў ад сякеры нейкага селяніна.

Гэтая перамога выратавала ВКЛ ад варожага нашэсця. Другая маскоўская раць, даведаўшыся аб паражэнні палкоў Шуйскага, паспешліва пачала адступаць да Смаленска, пакінуўшы ўвесь абоз у некалькі тысяч вазоў. Грандыёзнае нашэсце ганебна праваліласся.

Перамога каля Улы сарвала планы палякаў прывесці ВКЛ да уніі з Польскім каралеўствам. Кіраўнік ліцвінскай дэлегацыі Мікалай Радзівіл Чорны на Варшаўскім сойме, атрымаўшы вестку аб перамозе пад Улай, адмовіўся ад «нягоднай уніі» з Польшчай. Подзвіг Мікалая Радзівіла Рудога і ягоных мужных вояў апеў паэт Андрэй Рымша ў сваёй славутай паэме «Радзівіліяда», у якой гетман паўстае гераічным абаронцам сваёй краіны. У асобе Мікалая Радзівіла паэт бачыць узор рыцарскай годнасці і высакароднасці, ён як рыцар свабоды і справядлівасці супрацьстаіць нікчэмнаму і вартаму жалю нявольніку ўлады, крываваму тырану свайго народа цару Івану Грознаму.

У часы, калі Рэч Паспалітая знаходзілася без каралеўскай улады, Мікалай Руды («Вялікі і найпярвейшы сенатар і патрыёт, які горача любіць сваю айчыну») па сутнасці кіраваў ВКЛ. Ён ясна ўсведоміў тую вялікую адказнасць за лёс краіны і народа, якую ўсклала на яго гісторыя. «Дзеля дабра краю» ваявода віленскі і канцлер Мікалай Радзівіл не шкадуе сваіх сіл і гатовы на самаахвярнасць. У 1578 годзе шляхта і магнатэрыя ВКЛ пажадала, каб Руды ўзначаліў войска. Нягледзячы на паважны ўзрост, калі ўжо хочацца спакою, Радзівіл, як ён прызнаўся, «тую працу и владность гетманства великого в той потребе и небезпечности речи посполитое на себя принял». Новы гаспадар Стафан Баторый разлічваў на маральны аўтарытэт старога гетмана. Яго прыклад самаахвярнасці мусіў натхніць ліцвінаў на вайну за Полацк. А для Рудога гэтая вайна была справай гонару. Ён вельмі перажываў страту гэтага горада, які ў свой час не змог адваяваць у захопнікаў. І вось дзейны і таленавіты кароль-палкаводзец мабілізаваў усе сілы Рэчы Паспалітай для вяртання Полацка.

Войска ВКЛ пад начвалам Мікалая Рудога на пачатку жніўня 1579 г. першым падышло да Полацка і ўзяло яго ў аблогу. Высланыя Рудым атрады авалодалі маскоўскімі цвярдынямі Краснае, Казьян і Сітна, блакавалі Сокал, абложаны Полацк пазбавіўся знешняй дапамогі. 30 жніўня маскоўскі гарнізон здаў горад. Такім чынам Полацк зноў быў вернуты ВКЛ, а сам Мікалай Руды змог пазбавіцца ад пакут сумлення за сваю былую няўдачу пры абароне гэтага горада.

Кіраваў Мікалай Руды войскам ВКЛ і ў паходзе Стафана Баторыя на Вялікія Лукі. На міласць Рудога здаўся гарнізон моцнага Усвяцкага замка. Маскоўскіх воінаў гетман адпусціў. Падобную хрысціянскую літасць праявіў Руды і пры ўзяцці цвярдыні Азярышча. Таму і праславіўся ён у маскавітаў, як «справядлівы, вялікі і добры пан, які хоча міру». Менавіта яму Стафан Баторый даручыў весці перагаворы з маскоўскімі пасламі. Але яны не прынялі ўмовы міру, і вайна працягвалася. Спатрэбіўся яшчэ адзін паход — на гэты раз на Пскоў.

Узяць Пскоў было відавочна не па сілах войску Рэчы Паспалітай. А моцныя маразы і голад былі больш небяспечныя за варожую зброю. Руды настойваў на спыненні аблогі і мірных перагаворах з маскавітамі. Стары вопытны палітык і воін разумеў, што няўдалая аблога, а то і ўвогуле паражэнне, можа прывесці да больш сумных вынікаў. Трэба было скарыстацца прапановай цара аб міры, з якой той звярнуўся да Рудога. І Баторый пад ціскам Рудога пайшоў на перагаворы. Нарэшце, 15 студзеня 1582 года каля Яма-Запольскага быў заключаны мір паміж Рэччу Паспалітай і Маскоўскім царствам. Закончылася доўгая і разбуральная Лівонская вайна, якая доўжылася 19 гадоў. Вялікае Княства Літоўскае не толькі выстаяла, але і адваявала занятыя ворагам землі. Сярод гучных эпітэтаў і праслаўленняў, якімі асыпалі героя гэтай вайны Мікалая Рудога ўдзячныя суайчыннікі, самымі выразнымі падаюцца радкі з паэмы Яна Радвана «Радзівіліяда», дзе гаворыцца, што сваёй непахіснаю верай у перамогу Мікалай Радзівіл натхніў ліцвінаў на барацьбу з ворагам.

**Вітаўт ЧАРОПКА.**

■ Практычнае радзімазнаўства

# Разгадаць таямніцы прыроды

**Заўтра ў Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь адбудзецца адкрыццё персанальнай выстаўкі мастака Эдуарда Мацюшонка «Радзіма. Рэканструкцыя», прымеркаванай да Года малой радзімы.**

На выстаўцы будуць прадстаўлены работы-рэканструкцыі з партрэтамі, гербамі, будынкамі... У іх мастак глыбока раскрывае сутнасць паняцця радзімы: ад свайго роднага дома, дзе нарадзіўся і вырас, да спадчыны краіны. У прыватнасці, у экспазіцыі мастак пакажа свой род, а таксама дынастыі выдатных асоб Беларусі, якія стварылі для нас багатую гісторыю: Храптовічаў, Плятэраў, Баргдановічаў, Козел-Паклеўскіх, Любанскіх і іншых. І кожны з іх — у кантэксце іх вялікай спадчыны. Асобна будуць прадстаўлены работы, прысвечаныя гісторыі Вілейшчыны.

Цесная сувязь з продкамі, любоў да дома, які мастак называе каўчэгам, — гэтыя тэмы амаль у кожным палатне. Яны напоўнены глыбокімі філасофскімі разважаннямі аўтара і вельмі блізкія гледачу...

Эдуард Мацюшонак нарадзіўся ў вёсцы Мнюта Глыбоцкага раёна Віцебскай вобласці. З дзяцінства імкнуўся зразумець душу чалавека, выяўляў жаданне разгадаць таямніцы прыроды. Маляваў як адчуваў і разумеў. Для майстра былі і застаюцца блізкімі любоў і павага да роднай зямлі, яе жыхароў, бацькоўскага дому, таямніц прыроды, глыбінь гісторыі. Сам ён бясконца ганарыцца сваімі сялянскімі каранямі, нястомна разважае пра тое, як важна, каб дом, адкуль пачаўся шлях кожнага з нас, быў сапраўдным каўчэгам, вытокам любові і разумення.

З 1984 года мастак з сям'ёй жыве і працуе ў Вілейцы ў гімназіі № 1 «Логас», выкладае маляванне і курс «Айчынная і сусветная мастацкая культура», кіруе дзіцячай студыяй «Вясёлка». Многія з яго вучняў сталі дыпламантамі шэрагу конкурсаў у галіне дызайну і архітэктуры. З 1986 года распачаў актыўную творчую дзейнасць. Прымае ўдзел у міжнародных, рэспубліканскіх і рэгіянальных выстаўках. Усяго адбылося больш за 15 яго персанальных выставак, як у Беларусі, так і за мяжой. Работы мастака знаходзяцца ў прыватных калекцыях Беларусі, ЗША і Германіі.

**Варвара ГОМАН** ■

■ Сваімі словамі

# (Не) вылечнасць рамантыкі?



**«Прабач, што ледзь не вылечыў у сабе невылечнага рамантыка,» — гаворыць галоўны герой аднаго вядомага галівудскага фільма. Сапраўды, людзі часам так нагружаюць сябе паўсядзённымі справамі, клопатамі, вырашэннем пэўных праблем, што робяцца зусім неадчувальнымі... да жыцця.**

Не так даўно выдаўся ў мяне вольны час — пасля некалькіх таксама добрых паездак, і я з прыемнасцю вырашыла правесці яго ў вёсцы ў бабулі. Цёплы летні дзень удалечыні ад гарадскога шуму — што можа быць лепш? Увечары я маю звычку сесці там на ровар і праехацца па навакольных дарогах. Так зрабіла і гэтым разам, да таго ж час выбрала вельмі ўдала. Вечарэла, адна палова неба была афарбаваная ў прыгожыя ружова-барвовыя маляўнічыя колеры. А з другога боку, удалечыні, над верхавінамі елак ды іншых дрэў на блакітным, злёгку пацямнелым небе ззяла бліскучая срэбная поўня. Я бачыла яе даволі блізка, да таго ж была не абцяжарана вырашэннем пэўных праблем. Але ўнутрана, па інерцыі, я быццам працягвала некуды бегчы. Злавіла сябе на думцы, што не магу расслабіцца. Не атрымлівалася напоўніцу адчуць навакольную прыгажосць.

Падазраю, што многія людзі ў працэсе свайго сталення, няўмольнага абрастання абавязкамі губляюць чуллівасць душы. І нават лічаць гэты працэс заканамерным. Але я цвёрда вырашыла, што сваёй паэтычнай душы пастараюся не даць зачарсцвець. І ў думках звярнулася да Бога, каб ён дапамог мне адчуваць так гарманічна створаную прыгажосць.

Прайшоў і наступны дзень. Увечары я зноў рушыла знаёмым маршрутам па той жа пясчанай дарозе. І, на жаль, ніякіх змен у сабе не заўважыла. Затое ў наваколлі яны былі — гэтым разам заход сонца быў падфарбаваны памаранчавымі адценнямі. Я проста канстатавала для сябе такі факт. Можна ж бачыць — ды не заўважаць.

Трэці дзень, на маю радасць, паказаў, што ўсётакі час — добры лекар і дарадца ў многіх пытаннях. Трэба проста даць сабе крыху адпачыць. Пачакаць. Выдыхнуць і яшчэ раз набраць поўныя грудзі паветра, каб зноў разам з перапрацаваным кіслародам выйшлі лішнія думкі.

Гэтыя дні ў вёсцы я даволі шмат працавала ў гародзе. Паставанна піла гарбату на зёлках, седзячы на драўлянай лаўцы пасярод кветнікаў. Зрывала спелыя яблыкі, седзячы на даху, там жа ела іх і глядзела на залітыя сонцам палі. Гэты смак першых летніх яблыкаў для мяне быццам прычасце — і прабачэнне, і прыняцце чагосьці светлага, чыстага, такога сапраўднага. Што хаваць, я шмат спала, нікуды не спяшалася і ні пра што асабліва не думала. Чыстае вясковае паветра, самі ведаеце, надзвычай спрыяе глыбокаму сну. А на раніцу толькі галасісты певень асмельваўся парушыць царства спакою.

І на трэці дзень адбыўся цуд. Пасля абеду, схаваўшыся ад дзённай спёкі ў хаце, я глядзела праз акно на вуліцу. І стары сад нібы пачаў да мяне прамаўляць. Я быццам адчула смак яго яблыкаў, хоць і пакуль што няспелых, раздзяліла прыемны цяжар яго будучага, ужо хуткага ўраджаю, удыхнула салодкі водар саду, бачыла, як ён ружавее і як зелянее. Мяне нарэшце «адпусціла». І ў спрадвечным коле прыроды я стала на сваё месца. Зрабілася добра і хораша. Нікуды не хацелася з'язджаць. Але нават едучы ў горад, я ведала, што забіраю смакі і водары з сабой, што срэбны месяц дзесьці там, ва ўжо паралельным свеце, па-ранейшаму ззяе для мяне і для ўсіх, хто пабачыў таемнасць гэтай цішыні.

Калі гэтым летам у вас яшчэ не было свайго саду, калі не здарылася ніводнай вандроўкі ці дарогі, якая прынесла б палёгку стомленай душы, проста дайце сабе час. Дзесьці там, над гарызонтам, залітым апошнімі праменямі сонца, ужо пачынае ззяць яскравая зорачка. Яна разбудзіць вашага заснулага рамантыка.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ** ■

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомсельмаш» (продавец) извещает о проведении 7 сентября 2018 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | **Капитальное строение с инв. № 350/С-82121 площадью 705, 3 кв. м,** назначение – здание многофункциональное, наименование – **здание административно-производственное. Информация о земельном участке:** кадастровый номер **340100000003000775** площадью **0,1639 га** – для эксплуатации и обслуживания здания административно-производственного **(право аренды).** Местонахождение: **г. Гомель, ул. Рабочая, д. 7.** **Капитальное строение с инв. № 350/С-159313 площадью 0,0 кв. м, протяженность – 33,8 м,** назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения, наименование – **канализационная сеть.** Адрес: **г. Гомель, ул. Рабочая, 7, участок канализационной сети от КК-1 до КК-3. Информация о земельном участке:** кадастровый номер **340100000003002781** (присвоен предварительно). **Капитальное строение с инв. № 350/С-160641 площадью 0,0 кв. м, протяженность – 37,8 м,** назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – **тепловая сеть.** Адрес: **г. Гомель, тепловая сеть от административного здания до зданий мастерских и складов по ул. Рабочая, 7. Информация о земельном участке:** кадастровый номер **340100000003002820** (присвоен предварительно). **Капитальное строение с инв. № 350/С-159320 площадью 0,0 кв. м, протяженность – 63,6 м,** назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – **линия электропередачи.** Адрес: **г. Гомель, линия электропередачи от ТП-828 до здания по ул. Рабочая, 7. Информация о земельном участке:** кадастровый номер **340100000003002787** (присвоен предварительно). Гараж металлический 3,2х6 (инв. № по бух. учету 426), стеллаж металлический закрытый для хранения труб (инв. № по бух. учету 669), стеллаж металлический закрытый для хранения труб (инв. № по бух. учету 670), здание металлическое для отрезного станка (инв. № по бух. учету 672) | **625 198,44** | 31 259,92 |
| 2 | **Капитальное строение с инв. № 350/С-163045** площадью **457,7 кв. м,** назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – **здание специализированное розничной торговли (магазин).** Информация о земельном участке: кадастровый номер **340100000003003043** общей площадью **0,0538 га** – для эксплуатации и обслуживания здания специализированного розничной торговли (магазин) **(право аренды).** Местонахождение: **г. Гомель, ул. Шоссейная, 41В** | **457 200,00** | 22 860,00 |

**Продавец:** ОАО «Гомсельмаш», г. Гомель, ул. Шоссейная, 41. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.** 8 (0232) 59-23-93 – Мойсеенко Наталья Александровна. **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона. Для участия в аукционе необходимо: 1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама»):** р/с BY34 BAPB 3012 2093 7001 3000 0000, БИК BAPBBY2X, ОАО «Белагропромбанк», УНП 400071204, ОКПО 285728963000, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (указать № лота) **(задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления). 2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 7 августа 2018 г**. по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 5 сентября 2018 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения.**

**Для участия в аукционе предоставляются:** документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

**В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того**, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **15 (пятнадцати) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи и возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). **Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы». Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-56, 8(029)126-66-62**

## Извещение о проведении 21 августа 2018 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ №7»

| **Предмет торгов** |
|---|
| Трансформаторная подстанция общей площадью 42,7 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 200/С-50676; «складское помещение» общей площадью 15,8 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 200/С-50677; «производственно-бытовой корпус» общей площадью 118,0 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 200/С-50678 (составные части и принадлежности: проезжая часть, ограждение, ворота, калитка, ворота); «устройство моечного отделения щебня» общей площадью 589,0 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 200/С-63932; асфальтосмесительная установка ДС-185 (инв. № 620); агрегат мокрой очистки щебня (инв. № 762); емкость 10 куб. м (битум, инв. № 847); емкость 20 куб. м (битум, инв. № 848); емкость 20 куб. м (битум, инв. № 849); весы RV 3102 (инв. № 862); бункер приемный (инв. № 763); система видеонаблюдения (инв. № 0163); передвижное общежитие (инв. № 73); узел 1 подачи ж/с и щебня/конвейер 9 мп (инв. № 764); узел 2 подачи ж/с и щебня/конвейер 12 мп (инв. № 765); холодильник МИНСК 11 (инв. № 778); зеленые насаждения: липа № 22 (инв. № 918); тополь №10 (инв. № 906); тополь № 9 (инв. № 905); сосна № 14 (инв. № 910); сосна № 15 (инв. № 911); сосна № 17 (инв. № 913); береза № 1 (инв. № 897); береза № 11 (инв. № 907); береза № 12 (инв. № 908); береза № 13 (инв. № 909); береза № 16 (инв. 912); береза № 18 (инв. № 914); береза № 19 (инв. № 915); береза № 2 (инв. № 898); береза № 20 (инв. № 0916); береза № 21 (инв. № 917); береза № 3 (инв. № 899); береза № 4 (инв. № 0900); береза № 5 (инв. № 901); береза № 6 (инв. № 902); береза № 7 (инв. № 903); береза № 8 (инв. № 904) |
| Местонахождение: Витебская область, Витебский район, Новкинский с/с, д. Куковячино |
| Площадь земельного участка: 2,6274 га, кадастровый номер: 221287000010000001 |
| Начальная цена: 485 845,93 бел. руб. с учетом НДС |
| Сумма задатка: 48 500,00 бел. руб. |
| Обременение: аренда |

**Продавец имущества:** ОАО «ДСТ № 7», 223021, Минская обл., Минский р-н, 500 м восточнее д. Богатырево, АБК, тел. (017) 507-61-83.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к.10, 220030, г. Минск, тел. (017) 327-05-62.

**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 2 процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО «ДСТ № 7», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся 21 августа 2018 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 08.08.2018 по 17.08.2018 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:
(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(017) 507-61-83 (ОАО «ДСТ № 7»).

Центр Промышленной Оценки

• **Организация аукционов**
• **Оценка всех видов имущества**

### Извещение о проведении аукциона

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Общепит «Школьник», г. Барановичи, ул. Красноармейская, 4 |

**Предмет аукциона (одним лотом)**
**Местоположение – Брестская обл., г. Барановичи, ул. Брестская, д.112в**

| Наименование | Общ. пл. | Инв. номер |
|---|---|---|
| **Здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т.ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции)** | 71,8 кв. м | 110/С-96330 |
| **Здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т.ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции)** | 125,3 кв. м | 110/С-93613 |

Составные части и принадлежности: три кирпичных и один панельный сарая, навес, ограждение

**Сведения о земельном участке**: пл. **0,1057** га предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания производственных зданий

**Начальная цена лота с НДС 20 % – 97 080,00 бел. руб.**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30** (тридцати) дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

**Аукцион состоится 12.09.2018** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и **необходимые документы принимаются по 10.09.2018** до 17.00 по указанному адресу. Тел.: +375 17 280-36-37; 8 029 317-95-42. www.cpo.by**. Email: auction@cpo.by**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА (ПОНИЖЕНИЕ ЦЕНЫ НА 92 %) ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА СВИСЛОЧСКОГО ФИЛИАЛА ГРОДНЕНСКОГО ОБЛПОТРЕБОБЩЕСТВА

| | | | |
|---|---|---|---|
| | **Лот № 1** | | |
| Предмет торгов, краткая характеристика | **Капитальное строение, инв. № 413/С-18997** (бойня) с тремя пристройками общей площадью 348,2 кв. м, блочное, одноэтажное, 1923 г. п. Составные части и принадлежности: дезбарьер (51,1 кв. м); водопроводная сеть протяженностью 55,6 м; трубопровод; электрическая сеть протяженностью 4,1 м; кабель; ограждение из ж/б панелей – 92,5 м; площадка асфальтобетонная (190,0 кв. м); площадка из бетонных плит (201,1 кв. м). **Капитальное строение, инв. № 413/С-18998** (склад) общей площадью 42,9 кв. м, блочное, одноэтажное, 1925 г. п. Составные части и принадлежности: уборная (3 кв. м) | | |
| Местонахождение имущества: **Гродненская обл., Свислочский р-н, г.Свислочь, ул. Свердлова, д. 3Б, 3Б/1** | | | |
| Информация о земельном участке | Площадь 0,2444 га, кадастровый номер 425250100001001868, назначение – для размещения объектов иного назначения. Ограничения (обременения) прав: земельный участок, расположен в охранной зоне линий электропередачи (0,0139 га). Право аренды по 06.04.2113 года | | |
| Начальная цена | **9 845 рублей 68 копеек с учетом НДС** | Сумма задатка (5 %) | **492 рубля** |

**Сведения о продавце:** Свислочский филиал Гродненского облпотребобщества, г. Свислочь, ул. Комсомольская, 6, тел. 8 (01513)32495

**Сведения об организаторе торгов и номер счета для перечисления задатка**: Гродненское областное учреждение финансовой поддержки предпринимателей, г. Гродно, ул. Мицкевича, 8, тел. 8 (0152) 74 49 11, номер счета BY65BLBB30150500481906001002 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской обл., г. Гродно, ул. Мицкевича, 3, код BLBBBY2X, УНП 500481906

**Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 5 рабочих дней с момента подписания протокола о проведении торгов

**Условия оплаты:** предоставление рассрочки на 12 месяцев с уплатой первоначального взноса в размере 20%

**Торги состоятся 17 августа 2018 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8**

| | |
|---|---|
| Срок подачи документов для участия в торгах | **По 13 августа 2018 года включительно до 16.00 по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8** |

**Условия участия и порядок проведения аукциона: www.fincentr.by, тел. 8 (0152) 74 49 11, предыдущие публикации: газета «Звязда» от 06.03.18 г., 02.05.18 г., 23.05.2018 г., 22.06.2018 г.**

## РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторных электронных торгов по продаже квартиры в г. Москва, принадлежащей ОАО «БМЗ – управляющая компания холдинга «БМК»

**Лот № 310718001.** Трехкомнатная квартира с кадастровым (или условным номером) 77:07:0001002:22536. Г. п. – 1986. Назначение: жилое. Общая площадь – 75,3 кв. м. Жилая площадь – 46,4 кв. м. Этаж – 3. **Местоположение лота**: Российская Федерация, г. Москва, ул. Осенняя, д. 22, кв. 12. **Начальная цена (без учета НДС), рос. руб. – 11 823 748,77. Задаток, рос. руб. – 1 200 000,00. Шаг электронных торгов – 5 %**

**Дата и время начала проведения электронных торгов 28.08.2018 в 10.00 (по времени на ЭТП «ТОРГИБЕЛ»)**

Условия электронных торгов содержатся на сайте Организатора электронных торгов ino.by и на ЭТП «ТОРГИБЕЛ».

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом ЭТП «ТОРГИБЕЛ» с соблюдением требований Положения, утвержденных постановлением Совета Министров РБ № 608 от 12 июля 2013 г.

**Продавец:** ОАО «БМЗ – управляющая компания холдинга «БМК» 247210, Гомельская обл., г. Жлобин, ул. Промышленная, 37, тел. 8 (02334) 5-45-20, факс 8 (02334) 3-10-70.

**Организатор электронных торгов и оператор электронной торговой площадки:** РУП «Институт недвижимости и оценки» 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9, тел. 8 (017) 306-00-57.

**Электронный адрес ЭТП:** http://торги.бел.

Задаток в российский рублях перечисляется на р/с BY57BLBB30120190055182001006 в ОАО «Белинвестбанк», BIC банка BLBBBY2X, г. Минск, пр. Машерова, 29, не позже срока окончания приема документов на участие в электронных торгах. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в электронных торгах по продаже квартиры, принадлежащей ОАО «БМЗ – управляющая компания холдинга «БМК» (лот № 310718001), проводимых 28.08.2018 г. Аккредитация, регистрация и участие в электронных торгах осуществляется на ЭТП «ТОРГИБЕЛ». **Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами**: 23.08.2018 в 11.00.

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Предметом. Контактное лицо для осмотра Предмета электронных торгов: Бондаренко Владимир +74956496537 доб. 200. Детальная информация о порядке участия в повторных электронных торгах размещена на сайте ЭТП «ТОРГИБЕЛ» (http://торги.бел.).

Первое полное извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» от 15.02.2018 г.

**Организатор электронных торгов: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: tb@ino.by**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА 11.09.2018
**Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении торгов в виде открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Климовичирайагропромтехснаб»**

**Лот № 1.** Трактор МТЗ 3022 ДВ, заводской № 30200064, № двигателя 1499675, серийный № 000468, р/з ТА-6 5337, г. в. – 2007, инв. № 307.

***Начальная цена продажи: 20 579,70 бел. руб. с учетом НДС.***
***Сумма задатка: 2 057,97 бел. руб***

**Лот № 2.** Самоходная машина для химической защиты растений Matrot Maestria 17-39, заводской № 20903139, р/з ТА-6 5790, г. в. – 2009, инв. № 1460.

***Начальная цена продажи: 74 724,30 бел. руб. с учетом НДС.***
***Сумма задатка 7 472,43 бел. руб.***

| | |
|---|---|
| **Продавец** | ОАО «Климовичирайагропромтехснаб», УНП 700336791, г. Климовичи, ул. Болдина, 119 |

Расчетный счет для перечисления задатка: получатель платежа РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X

**Аукцион проводится 11 сентября 2018 года в 12.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, офис Могилевского филиала РУП «Институт недвижимости и оценки». Прием заявок на участие: по 10.09.2018 до 15.00 в рабочие дни с 8.30 до 12.30, с 13.30 до 16.30 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352

**Срок и условия оплаты приобретенного с аукциона имущества:** в течение 10 календарных дней со дня подписания протокола аукциона с победителем заключается договор купли-продажи. Оплата производится на условиях заключенного договора купли-продажи

Для участия в аукционе приглашаются граждане, юр. лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы, подавшие заявление на участие в аукционе (по форме, установленной Организатором аукциона); предоставившие заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, заявление об ознакомлении с документами, продаваемым Объектом (по форме, установленной Организатором аукциона) и заключившие с Организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (по форме, установленной Организатором аукциона), а также прилагаются следующие документы: юридические лица Республики Беларусь – копию свидетельства о гос. регистрации, копии учредительных документов, копию документа, подтверждающего постановку на учет в налоговом органе; индивидуальные предприниматели Республики Беларусь – копию свидетельства о гос. регистрации и документа, подтверждающего постановку на учет в налоговом органе; физ. лица – паспорт, представители физ. лиц и индивидуальных предпринимателей – паспорт и доверенность, удостоверенную нотариально; иностранные юридические лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранные индивидуальные предприниматели – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представители иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованную в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык.

Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Единственный участник имеет право приобрести объект по начальной цене, увеличенной на 5 %.

Участник, выигравший торги, уплачивает вознаграждение за организацию и проведение аукциона, в соответствии со счет-фактурой, которые подлежат уплате в течение 3 рабочих дней после проведения аукциона.

**Дополнительную информацию можно получить по тел.: (+375 222) 72-41-14, +375 29 624-26-25, +375 29 738-18-99**

# НЯЧЫСТАЯ СІЛА

Могілкі ў Чачэрску спрадвеку займалі тэрыторыю ледзь не побач з цэнтрам гарадка. І толькі некалькі гадоў таму памерлых пачалі хаваць у іншым месцы, за некалькі кіламетраў ад яго. А тады, у маім дзяцінстве, юнацтве і пазней, на тых могілках (пра традыцыйныя пахаванні мы тут гутаркі не вядзём) што толькі не адбывалася.

Напрыклад, нас, галапузую малечу, старэйшыя браты вучылі нічога не баяцца. І «палігонам» для выхавання, скажам так, адвагі і недапушчэння страху, нярэдка выбіралі могілкі. Для гэтага трэба было ў шэрай вячэрняй смузе або суцэльнай начной цемры перасячы іх з канца ў канец (а гэта больш за трыста метраў, відаць). Калі запускалі яны са старту адразу двух хлапчанят, дык ім было не так страшна. А калі па адным, дык, бывала, ляціш па сцежцы так, што толькі пяткі блішчэлі. А калі проста ісці, дык... Барані божа касавурыцца па баках ці натапырваць вушы, бо паблізу, у кустах, нешта ці нехта скавыча, скуголіць, кугукае, ляпае, а нешта белае, падобнае на прасціну, пагрозліва варушыцца.

Гэта куды пазней мы даведаліся, што той вэрхал-маскарад учынялі нам хлопцы-бальшуны з розных там засад. А тады, што і казаць, баяліся: могілкі ёсць могілкі. Там, былі ўпэўнены, усяго можна чакаць ад нячыстай сілы.

А аднойчы (было гэта, здаецца, у верасні) некаторыя жыхары двзюх прылеглых вуліц доўга не маглі спакойна заснуць. Бо з могілак гадзін да двзюх, а можа і трох ночы даносілася немае, як у Піліпаўку, воўчае выццё, якое час ад часу перамяжоўвалася з адчайным сабачым брэхам ці чалавечым крыкам. І калі хто з насельнікаў тых дамоў выходзіў на двор, каб даведацца, што там дзеецца, дык казаў, «канцэрт» быў такі, што валасы на галаве дыбам узнімаліся.

Пайсці ж ноччу туды ніхто такі не адважыўся. А выявілася ўсё раніцай. Аказваецца, нехта з тутэйшых, парушыўшы ўсе звычаі і правілы і ігнаруючы забарону мясцовых улад (пахаванні, як сказана вышэй, былі перанесены за горад), выкапаў яму для труны цішком, надвячоркам, каб назаўтра пахаваць тут родзіча. А ноччу ў яе ўтлуміўся п'яны мужык, а з ім, праз каторы час, і сабака.

З п'янкай звязана яшчэ адна гісторыя, што адбылася на могілках.

Адзін хлопец прывёў туды дзяўчыну, каб перад танцамі ў парку над Чачорай для весялосці крыху падзаправіцца. Бутэлькай віна, вядома ж. Для зручнасці апусціліся яны на курганчык, насупраць якога было свежае пахаванне (памёр малады мужчына) скрозь засланае і застаўленае вянкамі і кветкамі. Хлопец дастаў з кішэні шклянку, адкаркаваў бутэльку і прапанаваў дзяўчыне выпіць. Яна моўчкі крутнула галавой: не трэба. Тады ён наліў сабе, закусіў і пад прыглушаныя гукі аркестра, што даносіліся з парку, ужо больш настойліва прапанаваў: бяры! Тая ж гэтым разам громка заявіла: не хачу, не буду!

Тут раптам у бліках вулічнага ліхтара з тых вянкоў і кветак... вылазіць аголеная рука і чуецца жаночы голас:

— Яна не хоча, дай мне.

Божа літасцівы! Што тут адбылося! Хлопец ламануў прэч, натыкаючыся на крыжы і збіваючы ўсё, што трапляла пад ногі, а дзяўчына, ледзь не страціўшы прытомнасць, ціха папаўзла па сцяжынцы. Людзі казалі, што лёс хлопца застаўся ім невядомы, а вось няшчасная дзяўчына трапіла ў дом для вар'ятаў.

А п'янтосіха Еўка, што жыла недалёка ад нашага дома, з нагуляным сынам, спакойна высмактала віно і спала пад тымі вянкамі да самай раніцы...

# КАБ ЛЮДЗЯМ БЫЛО ДОБРА...

Гэту бабулю ўпершыню я ўбачыў мінулай вясной каля аднаго пяціпавярховіка. Яна ўвішна корпалася ў кветніку, што быў разбіты каля дома. Ці то садзіла якіясь краскі, ці то праполвала. Адна яна была, а дом — на тры пад'езды. І гэтак — цэлы месяц амаль.

Пасля мне неаднойчы даводзілася праходзіць тут і бачыць, што без справы на лавачцы яна ніколі не сядзела, а нешта рабіла: то вязала штосьці, то зашывала.

Аднаго разу я нават дзіву даўся, калі пачуў, як яна казала двум хлапчукам: шкарпэткі ў вас дзіравыя, дайце іх сюды, падпраўлю. Падумалася тады: а што, не магла яна гэта заўважыць ва ўнукаў дома, каб рабіць ім заўвагу прылюдна? Як бы ўгадваючы мае думкі, бабуля сказала ім: перадайце сваім мамам, калі ім трэба якая дапамога ад мяне, дык я заўсёды гатова.

— Унукі вашы? — спытаў я.

— Ды не, суседскія хлапчаняты. Маці ў абодвух не такія, як трэба. Не завіхаюцца каля дзяцей. А мне сумна без работы, без занятку, — і зірнула на мяне ўважліва: — Можа вам што трэба пачыніць-заштопаць — світар які ці джэмпер, дык калі ласка.

— Вы, няйначай, з вёскі пераехалі?

— Так, з вёскі. У дачкі вось гасцюю часова. Нічога рабіць не дазваляе. Сама з усім спраўляецца. А мне — сумна.

Пад восень бабулю зноў бачыў каля кветніка. Па ранейшаму адна корпалася там. Як быццам нікому з жыхароў дома і не было там спраў.

І вось — сакавік. Іду па вуліцы Катуніна. Трактары пазграбалі снег на ўзбочыны, а на скрыжаванні з вуліцай Сялянскай такія гуры ўтварылі, праз якія няёмка пералазіць чалавеку. Гляджу: мая знаёмая Іванаўна тут як тут. З вялікай пластмасавай лапатай спрабуе зрабіць зручны пераход на тратуар. Назад дадому вяртаюся з праспекта Леніна праз Сялянскую. І тут — тая ж самая бабуля. За тым жа заняткам.

— Няйначай, у ЖКГ на работу ўладкаваліся? — прывітаўшыся, цікаўлюся ў яе.

— Да не, — усміхаецца. — Сумна без справы дома сядзець. Бачыце, як усё расквасіла пад нагамі. Хачу, каб людзям добра было, каб зручна было хадзіць.

Іванаўна працавала. Міма праходзілі мужчыны, жанчыны, хлопцы, дзяўчаты. І хоць бы хто спыніўся, дапамог ёй...

# «ГАЛАДРАНЦЫ»

Не спіцца старой Кандрацісе вось ужо каторую ноч. З таго часу, як да яе на лета прыкацілі з Санкт-Пецярбурга ўнукі-сямікласнікі Мішка і Сяргейка. Даўно не бачыла яна іх, родненькіх, таму вельмі ўзрадавалася: вылітыя Іван і Леанід, яе сыны, яе крывінкі. І тут жа адчула, як спахмурнела душа, калі непрыкметна агледзела хлапчукоў з галавы да ног: у што яны апрануты. У абодвух на майках — выявы нейкіх пачвараў у акружэнні кітайскіх ці японскіх іерогліфаў. У Мішкі — доўгія, не па росце, закасаныя штаны, а ў Сяргейкі, наадварот, кароценькія, трохі вышэй каленак. Але на адных і другіх — дзірка на дзірцы свецяцца ды лапік на лапіку нібы карагод водзяць. Розных памераў і канфігурацый. Квадратамі, ромбамі ды трохвугольнікамі.

Вясковая дзятва, апавядала Акуліне Пятроўне паштальён Вера, першы раз пабачыўшы вашых унукаў у такім выглядзе, не магла адкleіцца ад іх ад вакзала да саменькай вашай хаты. Гужам ішлі за імі, тыцкалі пальцамі ў іхні бок і так рагаталі, што перапалохалі ўсіх сабак. Галёкалі: пудзілы, галадранцы! А Піліп Крот і Аксіння Гарошка, сельсаветскія актывісты, як вы ведаеце, нават пацікавіліся ў мяне, як вашай суседкі, як атрымалася, што сыны Акуліны Пятроўны Іван і Леанід, маючы добрую работу ў тым расійскім горадзе, дакаціліся да такога жыцця, што не здольны культурна і прыгожа апрануць сваіх дзяцей? І не апынуцца ніжэй узроўню нашага вясковага побыту?

— І што ты адказала ім? — спытала Кандраціха.

— Што дай божа такіх сыноў, як вашы, Акуліна Пятроўна, кожнай сям'і — разумных, старанных, паважлівых.

Размова з паштальёнам Верай пеканула жанчыну пад самы дых. Дык вось якое меркаванне вяскоўцаў пра яе сыноў і ўнукаў, ды пра яе — таксама! Цяжкія, бы камянюкі, думкі, затаўкліся ў галаве Кандраціхі, выклікаючы цэлы натоўп гаротных успамінаў і асацыяцый. Ціхенька, каб не разбудзіць унукаў, што спалі ў суседнім пакоі, старая паднялася з ложка, уключыла святло і ўзяла ў рукі сямейны альбом.

Вось вечна п'яны бацька і запалоханая ім маці. Пазбягаючы яго цяжкіх кулакоў, яна часцяком з ёй, Акулькай, начавала ў суседзяў. А вось і Кандрат, яе муж. Прыгажун



Фота носіць ілюстрацыйны характар.

і п'янтос, якога свет не бачыў. Як магла, яна адбівалася ў дзеўках ад яго заляцанняў. Ды ўсё дарэмна. Бо сваё жорсткае слова сказаў бацька: аддам толькі за яго, дамарослікa. (Кандрат сябраваў з братам Акуліны Васілём і быў заўсёды пад прыглядам іхняга бацькі Пятра Дзям'янавіча).

Той прымус для Акуліны вылез бокам. Спачатку маладзёны, здаецца, жылі без хмурынкі. Па ўсім было відаць, што Кандрат прыслухоўваецца да думак і парад свайго цесця ў адносінах да жонкі: не крыўдзі яе, гаварыў яму за чаркай. А чаркі тыя ляцелі адна за адной чарадой птушак, і прыйшоў час, калі Пётр Дзям'янавіч апрогся ад сівухі-самагонкі і апынуўся на могілках.

Кандрату зрабіць бы з гэтага разумныя высновы. Дык не ж. З уходам цесця на той свет, ён адчуў сябе гаспадаром-дыктатарам у доме. Ну і няхай бы сабе, калі б у п'яным ачмурэнні не пачаў лічыць рэбры Акуліны, замахвацца на яе сякерай, прапіваць дамашнія рэчы. Так працягвалася да таго моманту, калі на начной аўтамагістралі ён трапіў пад колы грузавіка, пакінуўшы ўдаву з чатырохгадовымі двайняткамі (вось яна на фотаздымку з Іванкам і Лёнечкам).

На гонях калгаса Пятроўна петалася з ранку да вечара за такія капейчыны, што не магла купіць падлеткам новае адзенне, і тыя вымушаны былі хадзіць у лахманах і абносках суседскіх дзяцей. Пазней, дзякуй богу, калгас узначаліў талковы кіраўнік, і справы ў ім пайшлі на лад. Праўда, не настолькі, каб адкладваць грошы на заўтрашні дзень, на высокую мару: вывесці сыноў у людзі, даць ім вышэйшую адукацыю ў самой белакаменнай.

Таму, калі тыя падраслі і набраліся сіл, Акуліна Пятроўна, не пакідаючы працу ў калгасе, зрабіла ўпор на пашырэнне ўласнай гаспадаркі. І тут яе надзейнымі і зацікаўленымі памочнікамі сталі Іван і Леанід. Трыццаць сотак агарода, дзве каровы з цялушкамі ды бычкамі, тры свінні з парсючкамі, гусі, куры, чатыры казы, іншая жыўнасць — вось над чым шчыравала гэта сям'я не адзін год.

І мара збылася! Хлопцы з глыбіннай палешуцкай вёсачкі, на здзіўленне ўсіх яе насельнікаў, без усякіх там рэпетытараў паступілі ў адзін з маскоўскіх універсітэтаў. Матэрыяльная дапамога маці, стыпендыя, дадатковыя заробкі студэнтаў на пагрузцы і выгрузцы вагонаў і, галоўнае, спадзяванне і апора толькі на свае сілы і стараннe дазволілі ім паспяхова закончыць яго і ўладкавацца на работу ў горадзе на Няве, завесці сем'і, атрымаць добраўпарадкаваныя кватэры.

І што ж у рэшце рэшт? Артылерыйскі залп. Як у вайну: у былых галадранцаў Івана і Леаніда — дзеці галадранцы Мішка і Сяргейка. Сорам! Ганьба! Як перажыць іх? Што рабіць? Такія вось маркотныя думкі мучылі Кандраціху да самага світанку, покуль сон не адолеў яе.

Акуліна Пятроўна некалькі дзён не магла зразумець прычыну катастрафічнага збяднення сваіх сыноў з іх сем'ямі. Бо ў пісьме, якое Вера ўручыла ёй, Іван пісаў, што ў іх усё добра, што ён з жонкай толькі што вярнуўся з турыстычнай паездкі па Швецыі, што Леанід следам за ім набыў японскую легкавушку...

Дык якія яны галадранцы, думала жанчына. Яснасць жа ўнёс той самы сельсавецкі актывіст конюх Піліп Крот. Дэпутат завітаў да яе ў хату, каб высветліць напярэдадні сесіі, якія пытанні хвалююць пенсіянераў. Заадно пацікавіўся і справамі яе сыноў. Жанчына ва ўсім прызналася яму — і пра тое, што думаюць аб іх аднавяскоўцы, і пра тое, што піша аб тых справах яе Іван. Піліп Цітавіч уважліва прачытаў пісьмо і аўтарытэтна заявіў: хацелася б верыць Івану, ды не даводзіцца. Проста ён супакойвае цябе, Пятроўна, каб не хвалявалася, не кінулася адпраўляць ім пасылкі. На самай справе ўсё не так. Ты чула, што-небудзь пра амерыканскія ды заходнееўрапейскія санкцыі да Расіі і пра фінансава-эканамічны крызіс? Вось яны і пеканулі па грамадзянах нашай усходняй суседкі. Збяднелі людзі, што і казаць, галадранцамі становяцца. Ты што, не бачыш, якое адзенне ў тваіх унукаў? Так што мяркуй сама...

Ён крыху памаўчаў, а потым дадаў:

— А за мной, Пятроўна, абяцаю: арганізацыя фонду дапамогі сем'ям тваіх сыноў з боку жыхароў вёскі.

Меркавала-меркавала Кандраціха, што да чаго, ды на наступны дзень пашыбавала ў райцэнтр. Зняла з ашчаднай кніжкі ладную суму грошай і адаслала іх у Санкт-Пецярбург, пакінуўшы сабе на пражытковы мінімум. А ўнукам купіла новую вопратку, якую, пасмяяўшыся над бабуляй, тыя прынялі ў штыкі. Бо іхняя «размаляваныя» дзіркамі і лапінамі джынсы і шорты, аказваецца, — гэта ноу-хау. Піск моды. Шык. Супер. Самы высокі еўрапейскі ўзровень моды. Да чаго іхняя вёска яшчэ не дарасла.

Пісьма ад сыноў Акуліна Пятроўна не дачакалася. Праз два тыдні яны прыджгалі да маці самі і, калі аб усім даведаліся, то было аб чым пагутарыць і над чым пажартаваць. А ў адказ на прапанову Піліпа Цітавіча стварыць фонд дапамогі іхнім сем'ям уладкавалі вечарыну, на якую запрасілі з дзясятак землякоў. Выпівалі, закусвалі, гаварылі тосты. Самы закавырысты пасля трэцяй чаркі быў у дэпутата Крота:

— Паглядзеў я на вас, Іван Кандратавіч і Леанід Кандратавіч, і скажу: ніякімі санкцыямі і фінансава-эканамічнымі крызісамі нас, славян, буржуі не запужаюць, не дастануць. Здароўя і дабрабыту вам, вашым дзецям і вашай маці.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

# ПАД ЗВОН МЯЧА І ГУКІ СЯРЭДНЕВЯКОВЫХ МЕЛОДЫЙ

## Старажытны Мсціслаў за тры дні свята «Рыцарскі фэст» наведалі тысячы гасцей і каля 300 рыцараў



Фота БелТА.

**Калі б на фэсце была традыцыя выбіраць Міс свята, напэўна, большасць галасоў гэтым разам аддалі б маленькай Сашулі з Санкт-Пецярбурга. Дзяўчынка стала гераіняй тэле- і газетных рэпартажаў. Яна самая юная ўдзельніца мерапрыемства. У суботу, дзень адкрыцця фэсту, ёй споўнілася роўна два гады!**

### Рыцарства — хобі сямейнае

Раней даводзілася пісаць пра пару са Смаленска, якія прыязджалі на фэст разам з дачушкай. Гэтым разам цэлым сямействам прыехалі рыцары з Санкт-Пецярбурга — бацькі з двухгадовай дзяўчынкай і нават... бабуля. Усе яны — удзельнікі камандоры Паўночнага Храма.

— Наша дзяўчынка — патомны рэканструктар, — жартуюць рыцары. — Нават дзень нараджэння прыйшоўся на фэст. Першы яе выезд на падобныя мерапрыемствы адбыўся год таму. А сёлета яна ўжо паспела пабываць на пяці фестывалях у Пскоўскай і Ленінградскай абласцях.

Каб бацькі падзялялі хобі сваіх дзяцей — гэта рэдкасць. Але Таццяна — як раз той самы выпадак. Расказвае, што сын «падсеў» на рыцарства пасля таго, як яны разам наведалі Вісбю — горад у Швецыі. Ну, а яна, як любячая маці, стала дапамагаць ва ўсім і сама непрыкметна захапілася.

Такія мерапрыемствы, кажуць рыцары, дапамагаюць на некаторы час адарвацца ад гарадскога жыцця і адпачыць душой, адчуць смак падарожжаў, перанесціся на некалькі стагоддзяў назад — рамантыка, адным словам.

— Мы свайго роду даследчыкі, — кажа рыцар камандоры Кірыл. — Мяне з сябрамі аб'ядноўвае гістарычнае братэрства. А ў звычайным жыцці я, напрыклад, інжынер, займаюся радыёэлектронікай.

Быць рыцарам па-сапраўднаму, гэта цэлая навука. Трэба ўмець шыць такія ж касцюмы, як і нашы продкі стагоддзі таму, гатаваць ежу ў паходных умовах, клапаціцца пра сваё паходнае жытло.



Двухгадовая ўдзельніца фэсту з бацькамі і бабуляй.

— Вось гэты шацёр я шыла ўручную два гады, — усміхаецца маці Сашулі, Насця. У рыцарскі быт яна пагрузілася гады тры-чатыры таму ўслед за мужам, а вось у Беларусь прыехала ўпершыню. І ёй спадабалася.

Што датычыцца астатніх членаў каманды, то ў Беларусі яны не такія і рэдкія госці. У Полацку, Мінску, Лідзе, напрыклад, ёсць аддзяленні камандоры, і мсціслаўскі фэст адна з падстаў сустрэцца.

### 30 і болей кілаграмаў амуніцыі

Нягледзячы на тое, што сіноптыкі абяцалі ў суботу дождж і нават навальніцу, а 10-й гадзіне раніцы — час пачатку афіцыйнага адкрыцця фэсту — было, здаецца, усе плюс 30. І за дзень не выпала ні кроплі! Рыцары, асабліва тыя, што ў даспехах, дэманстравалі прыклады выключнай вынослівасці і майстэрства. Яны мужна стаялі на залітай пякучым сонцам плошчы і цярпліва чакалі, калі вялікі князь Мсціслаўскі і Смаленскі Расціслаў Мсціславіч адкрые свята і будзе па традыцыі рассечаны канат — сігнал да пачатку дзеянняў. А потым урачыстай калонай пайшлі на месца баявых дзеянняў — замкавую гару. І змагаліся там да самага вечара. Бралі замак, біліся за мост, дэманстравалі сваё майстэрства ў іншых рыцарскіх спаборніцтвах. А яшчэ танцавалі і вучылі іншых старадаўнім танцам, дэманстравалі ўсім ахвотным баявыя прыёмы. Пад сценамі вежы-данжона раскінуўся цэлы палатачны горад. Гарэлі вогнішчы, у кацялках кіпела вада, жанчыны ўвіхаліся на кухні.

Рыцары не давалі сабе расслабіцца. Трэба яшчэ мець здароўе, каб у такую спякоту хадзіць у амуніцыі, вага якой 30 і болей кілаграмаў.

— Нас прыехала 10 чалавек, другі год удзельнічаем, — расказваў адзін з удзельнікаў магілёўскага ваенна-гістарычнага клуба, які займаецца рэканструкцыяй XIV стагоддзя. — Фэст цудоўны, а сёлета яшчэ лепш, чым летась. Шмат прыезджых, з Расіі, у тым ліку. Гэтым разам некалькі нашых таварышаў пашылі сабе касцюмы чумных дактароў. Гэта ж якраз наш перыяд.

А вось убранні дзяўчат мне падаліся вельмі сціплымі.

— У кожнага сваё ўяўленне аб прыгажосці, — пакрыўдзіліся прыгажуні. — Калі вам патрэбны прынцэсы, то гэта не да нас.

Кацярына вось ужо восем гадоў у клубе. Прыйшла туды, калі ёй было 15.

— Цікава не проста хадзіць у сярэдневяковых сукенках, прываблівае стыль жыцця, эмоцыі паходнага быту. Двойчы хацела кінуць, але не атрымліваецца.



Рыцары з клуба «Залатая шпора».

### Магчымасць пакланіцца святым

Арганізатарам рыцарскага фэсту ў свой час было ў тым ліку і духавенства. Бо рыцары — гэта яшчэ і глыбока веруючыя людзі. Успомніць тую ж Кулікоўскую бітву, на якую Дзмітрыя Данскога натхніў святы прападобны Сергій Раданежскі. Раённыя ўлады разам з Магілёўскай епархіяй далі магчымасць пакланіцца ўдзельнікам фэсту мошчам дзевяці святых. У храме Сілуана Афонскага ішлі малебны і было арганізавана вячэрняе богаслужэнне.

У кармеліцкім касцёле адбылася ўрачыстая імша ў гонар храмавага свята. У ёй прынялі ўдзел 15 ксяндзоў.

А каля кагальнага калодзежа народ адводзіў душу цалкам, бо ад яго веяла вельмі запатрабаванай у гэтыя спякотныя дні выратавальнай прахалодай. Людзі набіралі гаючую ваду і з задавальненнем гулялі па халодным да дрыжыкаў ручаі.

### Савецкая, Пірагоўская, Калініна...

Падчас фестывалю гэтыя вуліцы ператварыліся ў гандлёвыя рады аднаго вялікага кірмашу, дзе можна было і смачна паесці, і выбраць сабе сувенір па душы. Шмат цікавых забаў прапаноўвала пляцоўка на тэрыторыі езуіцкага манастыра, дарэчы, таго самага комплексу, які пацярпеў падчас сёлетняй зімы, — абрынулася частка адной з пабудоў. Гэтая зона была загароджана, працавала частка, дзе ў свой час праводзіліся аднаўленчыя работы. Тут запрашала да сябе сярэдневяковая школа і старадаўняя карчма. На дэманстрацыйным стале можна было ўбачыць стравы, якія ўжывалі нашы продкі — гарох калодкай, аўсяны кісель, суп хлебны сялянскі, хлеб аржаны, кашы аўсяная і ячная... Усё гэта было прыгатавана па старадаўніх рэцэптах кухарамі мсціслаўскай гімназіі. Ахвотным не адмаўлялі ў дэгустацыі. Можна было яшчэ выпрабаваць сябе і ў якасці вучня часоў Сярэдневякоўя.



Праверка на «чуму»

— У старадаўнія часы рыцары павінны былі не толькі фехтаваць, але ведаць матэматыку і ўмець іграць на музычных інструментах, — удакладніла **намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце гэтай установы Ганна СОКАЛ.**

У падвале старадаўняга будынка работнікі сістэмы адукацыі частавалі гарбатай і зробленымі сваімі рукамі пірагамі — з рыбай, павідлам, капустай. Смачна, словамі не перадаць.

Кожная ўстанова адукацыі, а іх у раёне каля двух дзясяткаў, рыхтавала па два вялікія пірагі.

Сустракала гасцей сама Кацярына II, правярала веды па астраноміі і вершаскладанні.

### Музей ад... бібліятэкі

Мсціслаўскі фэст як заўсёды прапаноўваў шмат цікавых выставак. Падвалы кармеліцкага касцёла, дзе нават у спякоту халаднавата, заўсёды вабяць гасцей сваёй загадкавасцю і таямнічасцю. Гэтым разам выстаўку тут арганізавала бібліятэка. Цікава, што кнігі на старадаўні манер віселі, прыкаваныя да сцяны.

— Кнігі ў тыя часы каштавалі шмат і вельмі цаніліся. Іх прыкоўвалі, каб ніхто не ўкраў, — патлумачыла **бібліятэкар Людміла КОТАВА.**

А яшчэ дэманстраваліся строі, прадметы побыту. Цікава, што ўсё гэта належыць сельскай бібліятэцы з Падлужжа.

Творча падышлі да сваёй місіі — паказаць, з чаго ўсё пачыналася, прадпрыемствы, арганізацыі і ўстановы раёна. Цэнтральная раённая бальніца дэманстравала старадаўнія лекі, адвары і зёлкі.

— У нас лекі на любы густ, — запэўнівалі медыкі. — Усе, чым лячылі ў старажытнасці. Некаторымі дагэтуль карыстаемся. Гэта добрае слова, гарбата на любы густ — скрыпень, мята, меліса. Малітвы — таксама добрая рэч. Раней так лячылі.

А яшчэ ўвесь час, пакуль у горадзе гучалі дуды і барабаны, зверху раздаваўся шум верталёта. Сёлета ў гасцей свята была магчымасць убачыць старажытны горад з вышыні птушынага палёту.

— Для нас вельмі адказна быць захавальнікамі такой багатай гісторыі, — сказаў у сваёй прамове на адкрыцці **старшыня Мсціслаўскага райвыканкама Аляксандр ПРАКОПАЎ.** — Гэта свята — візітная картка раёна. Мы заўсёды адчуваем сувязь часу і гістарычных падзей. На фэст заўсёды прыязджаюць тысячы гасцей з розных куточкаў свету. Хацелася, каб у іх сэрцы назаўжды засталася цікавасць да гэтага горада і жаданне вярнуцца сюды зноў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

■ Ёсць нагода

# ЧАЛАВЕК ТЭАТРА

## Аднаму з самых вядомых беларускіх акцёраў Віктару Манаеву — 60

**На ягоным рахунку — вялікія і малыя, але аднолькава цікавыя, глыбокія ролі амаль у некалькіх дзясятках фільмаў і тэатральных пастановак, прэмія Ленінскага камсамола, Дзяржаўная прэмія СССР, званне народнага і заслужанага артыста і дзве Дзяржаўныя прэміі Беларусі.**


kupalauski.by.

Сцэна са спектакля «Вячэра з прыдуркам».

Гледачы помняць і любяць акцёра ў самых розных амплуа: адным бліжэйшы трагічны і гераічны персанаж Лёнька Адуванчык з «Радавых» у пастаноўцы Валерыя Раеўскага, другім — прыгажун Мікіта Зносак з культавага спектакля «Тутэйшыя», які рэжысёр Мікалай Пінігін рабіў спецыяльна «пад Манаева», іншым тэатралам больш даспадобы ягоны Франсуа Піньён у «Вячэры з прыдуркам», каларытны Гольдберг у «Местачковым кабарэ» або станавы прыстаў Кручкоў у «Пінскай шляхце». Асабіста я пяшчотна люблю Віктара Сяргеевіча з часоў першых пастановак спектакля «Арт», — але разумею, што гэта толькі кропля ў моры акцёрскіх знаходак і вобразаў Манаева... Сёння акцёр, чыё імя ўжо больш за 35 гадоў звязана з Купалаўскім тэатрам, адзначае 60-годдзе.

**— А ў вас ёсць любімая роля Манаева?** — цікаўлюся ў **мастацкага кіраўніка Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы Мікалая ПІНІГІНА,** з якім акцёр цесна працуе ўжо больш як 30 гадоў.

— Так адразу цяжка адказаць. Мы працуем разам з 1985 года і зрабілі, як аднойчы падлічыў Віктар, каля 20 спектакляў, і ён настолькі арганічны ва ўсіх ролях — ён жа вядучы артыст тэатра, без перабольшання геніяльны, — кажа рэжысёр, які, дарэчы, адзначае дзень нараджэння з розніцай у адзін дзень з Манаевым. — Магу прыгадаць спектакль, які, на жаль, мала ішоў, — «Касцюмер» Харвуда. Мы паставілі яго ў 1997 годзе, і там сыграў сваю апошнюю ролю Мікалай Яроменка, потым Валянцін Белахвосцік, але абодва яны пайшлі з жыцця, і спектакль хутка знік з рэпертуару. Аднак вось там, на мой погляд, была выдатная роля ў Віктара Манаева, бо ён сыграў чалавека тэатра: касцюмера пры вялікім артысце сэры Джоне, які быў настолькі аддадзены тэатру, што памёр проста падчас спектакля следам за сваім кумірам. Па сутнасці, Манаеў сыграў самога сябе, чалавека, для якога тэатр — справа ўсяго жыцця... Аднак, калі па шчырасці, то можна назваць у якасці найлюбімейшых сумесных работ і «Тутэйшых», і «Пінскую шляхту», і «Рэвізора», і «Арт», і дзясяткі іншых спектакляў, усе я проста не прыгадаю. І гэта ўсё будзе праўдай, бо ён мой любімы артыст з усяго гэтага пакалення, а ўвогуле і адзін з самых моцных артыстаў у Беларусі.

**— І што вы пажадаеце любімаму артысту ў прыгожую круглую дату?**

— Здароўя, як заўжды, добрага настрою, добрых людзей у блізкім акружэнні. Але ён настолькі гарманічны чалавек, які да ўсяго падыходзіць і з розумам, і з тонкім гумарам, што мне здаецца, у яго ўсё і так добра. Ён заслужыў самых цёплых слоў, і гэта не толькі маё меркаванне, а меркаванне гледачоў, якія спецыяльна ходзяць у Купалаўскі «на Манаева», — і я рады, што гэта працягваецца шмат гадоў.

*Што тут дадаць? Хіба толькі тое, што «звяздоўцы» з глыбокай павагай і ўдзячнасцю далучаюцца да віншаванняў і зычаць Віктару Манаеву моцнага здароўя, асабістага і творчага даўгалецця і новых яркіх роляў! З юбілеем!*

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК**


kupalauski.by.

Сцэна са спектакля «Рэвізор».

■ Адпачываем

# VIVA BRASLAV OPEN AIR: УСЁ ВЫШЭЙ!

## На браслаўскім пляжы прайшоў музычны фестываль

**Палётаць на паветраным шары, паласавацца нетрадыцыйнай ежай, сваімі вачыма пабачыць Мальбэка і Сюзану — усё гэта і не толькі можна было зрабіць у Браславе 3-4 жніўня. Маляўнічы горад шосты раз прывітаў гасцей на галоўным музычным фестывалі краіны.**

Браслаў славіцца сваімі краявідамі: горад месціцца на беразе возера Дрывяты, што ўваходзіць у знакамітую сістэму Браслаўскіх азёр. Штогод ён збірае турыстаў з розных куткоў Беларусі і замежжа. А апошнім часам Браслаў карыстаецца яшчэ большай папулярнасцю. У дні фестывалю нават дарожны рух перакрыты з-за наплыву людзей, гасцініцы перапоўнены, а свабодныя пакоі ў дамах мясцовых жыхароў здаюцца прыезджым.

Мы размясціліся ў дзеда Віктара (як ён сам прадставіўся). У параўнанні са сталічнымі цэнамі на здымнае жыллё ён амаль што нічога з нас не ўзяў: «Не магу я карыстацца гэтым. Ёсць дзе спыніцца, і добра!» Хата знаходзіцца за дзесяць хвілін ад галоўнай сцэны, таму ўжо каторы год жнівеньскімі начамі ён і яго сям'я засынаюць пад гучную музыку, выбухі салютаў і гучныя размовы пад вокнамі. «Падчас фестывалю горад ажывае, — расказаў дзед Віктар. — Насельніцтва ў нас невялікае (каля 10 тысяч — **Аўт.**), таму гэта добра адчуваецца».

І сапраўды, білетаў сёлета прададзена каля 23 тысяч. Гэта значыць, што людзей у Браславе на некалькі дзён стала ўдвая больш. Зараз нават цяжка ўявіць, што першапачаткова найбуйнейшы музычны фестываль краіны планаваўся як звычайнае спартыўнае свята на стадыёне. Арганізатары мерапрыемства, мясцовыя браты Алег і Яўген Лабуці, за некалькі гадоў паднялі яго з гарадскога на рэспубліканскі ўзровень.




Сёння ў Браслаў з'язджаюцца з усіх куткоў краіны. Некаторыя мінчане нават прамянялі на яго знакаміты «Рок за Баброў», які праходзіць у той жа час у сталіцы. «Прыязджаю на фестываль ужо другі раз, — расказала студэнтка сталічнага каледжа Ірына Слінько. — Летась спадабалася выступленне беларускай спявачкі Iowa, а сёлета больш за ўсіх запомніўся прадстаўнік нашай краіны на «Еўрабачанні» — Alekseev. Напэўна, фестываль стане для мяне традыцыяй, бо атмасфера сапраўды ўражвае! І зусім нічога, што дзеля гэтага трэба пераадолець тры гадзіны дарогі».




Не праігнаравалі мерапрыемства і курсанты Ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь — Антон Гарбатко і Улад Вішнеўскі вырашылі правесці першыя дні свайго летняга адпачынку менавіта ў Браславе. «За год вучобы і службы сапраўды стаміліся, — падзяліўся Антон. — А тут і паплаваць можна, і патанцаваць». А Улад дадаў, што планавалі паездку цэлы год і цалкам задаволеныя. «Асабліва парадавала выступленне Мальбэка і Сюзаны, мы з маёй дзяўчынай іх вельмі любім».

Акрамя эпатажных украінскіх спевакоў, на сцэне фестывалю з'яўляліся і беларускія гурты Nizkiz і Nuteki, былы саліст гурта «Смысловые галлюцинации» Сяргей Бабунец, Іван Дорн, Б'янка, Арцём Півавараў і іншыя. Усе артысты вызначаліся сваім стылем, манерай стасункаў з публікай, своеасаблівымі «фішкамі». Б'янка, напрыклад, уразіла гасцей веданнем беларускай мовы, а ўкраінец Alekseev на ўвесь голас прызнаўся ў любові да нашай краіны.

Па-за сцэнай таксама было на што паглядзець. Налічвалася шмат фуд-кортаў і забаўляльных пляцовак. Так, напрыклад, можна было набіць часовую татуіроўку, скокнуць з вышыні на батут, пастраляць у ціры, сфатаграфавацца і тут жа бясплатна атрымаць раздрукаваныя фотаздымкі. Адной з самых цікавых была прапанова паглядзець на Браслаў з вышыні птушынага палёту. Гэта можна было зрабіць двума спосабамі: на верталёце і на паветраным шары. Апошні значна выйграваў у цане, але прайграваў у якасці: падымаўся на вышыню 10 метраў і трымаўся там некалькі хвілін. У той час як верталёт каля дзесяці хвілін кружыў над возерам і горадам, рабіў перавароты і дарыў пачуццё бязважкасці. «Гэта немагчыма з чымсьці параўнаць, — падзялілася ўражаннямі Каця, якая ўпершыню каталася на верталёце. — Рукі і ногі дрыжаць, але я адчуваю сябе шчаслівай!»

